беларуская газэта. Заснаваная ў 1906 г. у Вільні. Адноўленая тамсама ў 1991 г. як штомесячнік. З 1 сакавіка 1996 г. выходзіць у Менску штотыднёва

# НАША НІВА

№ 6 (44)
15 красавіка 1996 г.
панядзелак

выходзіць у панядзелкі

КУЛЬТУРА, ПАЛІТЫКА

ТЭЛЕПРАГРАМА

БІРЖА ПРАЦЫ

*Пятро Краўчанка:*

## “НАША МОЛАДЗЬ НЕ ПАВІННА ПАЙСЬЦІ Ў ЛЯСЫ”

*Старшыня Камісіі Міжнародных Справаў Вярхоўнага Савету Пятро Краўчанка адказвае на пытаньні карэспандэнта "Нашай Нівы" Алега Дашкевіча.*



**“Наша Ніва”: Як Вы ацэньваеце сёньняшнюю сытуацыю ў краіне: падпісаньне дамоваў у Маскве і рэакцыю на гэта ў Менску.**

Пятро Краўчанка: Падзея адбылася. Я думаю, што для палітыка галоўныя тут два моманты. Першы: уважліва слухаць народ і не дапусьціць таго, каб усё закончылася крывёю. Любыя акцыі маюць сэнс толькі тады, калі яны накіраваныя на тое, каб прыносіць шчасьце людзям. І другі момант: захаваньне дзяржаўнасьці і сувэрэнітэту, выкананьне Канстытуцыі, якая не павінна быць фігавым лістком. Сёньня мы назіраем працэс, калі, грунтуючыся на фармальным волевыяўленьні народу, Лукашэнка робіць нетрадыцыйныя крокі. У такой сытуацыі кожны палітык павінен паказаць вельмі высокі ўзровень майстэрства: каб захаваць сувэрэнітэт дзяржавы і Канстытуцыю, ня быць здраднікам. І ў той самы час зрабіць так, каб наша гарачая моладзь не пайшла ў лясы.

*Працяг на старонцы 2*

**ПАДАРОЖНЫЯ НАТАТКІ**

## Каталёнскі каляж

Адам Глёбус вяртаецца з свайго падарожжа ў Каталёнію. Ягоныя назіраньні зьбіраюцца ў каляж. Першае ўражаньне: “У чужой краіне адразу заўважаеш, як шмат людзі гавораць. І хочацца стаць мастаком, каб як мага менш адкрываць рот”.

*Старонкі 22-23*





# АЛАХ АКБАР

*Інтэрвію з тэрарыстамі*

На карпацкай турбазе аўтар сустракаецца з чатырма чачэнцамі, якія тут адпачываюць і набіраюцца сілаў. Аўтар ставіць перад сабой мэту “зазірнуць за прызму вайны”.

“Шаміль, Руслан, Салам і Алекс, — баевікі, тэрарысты, партызаны, маджахеды, змагары, бандыты, — таксама бянтэжыліся, губляліся пры кожным нечаканым пытаньні, хаця мелі за плячыма не адзін дзясятак баёў; яны забівалі і дабівалі; у іх на вачох каналі іхныя таварышы; Руслан быў сьведкам таго, як гарэў ягоны дом; Салам выцягваў з-пад рэштkaў бліндажыка парэшткі сваёй бабулі (дакладнае пападаньне бомбы), а на Алекса паляваў расейскі шрубалёт”.

“Пасьля гутаркі з чатырма хлопцамі ў засьнежаным Ярэмчы я зразумеў, чаму Сьвятлана Алексіевіч, напісаўшы пра цынкавых хлопчыкаў і чарнобыльцаў, адмовілася ехаць пісаць пра Чачэнію і заракл ася кранаць ваенную тэму наагул”.

*Старонка 3*

## Тэрор... у абарону Канстытуцыі

Апошнім часам з вуснаў беларускіх палітыкаў часта зьлятаюць словы пра пагрозу экстрэмізму ў краіне. Гавораць пра “лясы”, згадваюць партызанку мінулай вайны, Ірляндыю... Шматлікія блёк-пасты з аўтаматчыкамі на беларускіх дарогах, газ і дубінкі спэцназу ў часе мітынгаў, бязьмерна разьдзьмутая асабістая ахова прэзыдэнта, таблічкі “Побач з будынкам праход забаронены” каля адміністрацыі — усё гэта таксама не пасяляе ў душы спакою. Урэшце і заклікі “Не дапусьціць крыві!” або “Захаваць грамадзянскі мір!” ні пра што добрае ня сьведчаць. Ствараецца ўражаньне, што нехта наўмысна нагнятае напружаньне ў грамадзтве, якое зусім ня схільнае да экстрэмізму.

*Старонка 2*

### У Літве створаны лягер для палітычных уцекачоў

Чакаецца, што разам зь веснавым цяплом праз Літву зноў хлынуць уцекачы, якія імкнуцца трапіць на Захад. Днямі пасьля перапынку каля польскага кардону былі затрыманыя 109 іншаземцаў, якія рыхтаваліся да нелегальнага пераходу дзяржаўнай мяжы. Як правіла, мігранты прыходзяць у Літву зь Беларусі.

Пасьля далучэньня да Жэнэўскай канвэнцыі ААН аб статусе ўцекача, Літва павінна стварыць цэнтар разьмяшчэньня мігрантаў. Яго плянуецца адкрыць у Рукле (Ёнаўскі раён) на былой вайсковай базе. Ён будзе разьлічаны на 340 месцаў. Тут атрымаюць часовы прытулак людзі, якім з палітычных матываў на радзіме пагражае небясьпека.

*Падрабязна пра гэта – на старонцы 6*

***Харвацкія грамадзяне панічна корпаюцца ва ўласных ды чужых біяграфіях, адшукваючы заганы. Адкрытае дэкляраваньне этнічнае прыналежнасьці сталася асноваю бон тону. Усё пачалося са словаў самога прэзыдэнта, які заявіў, што ён шчасьлівы, бо ягоная жонка ані сэрбка, ані жыдоўка, а сапраўдная харватка.***

*Эсэ харвацкай пісьменьніцы — на старонцы 20*

## навіны 1 радком........

**ЗАБРАЎ!** Указам прэзыдэнта закрытае акцыянэрнае таварыства "Міжбанкаўская валютная біржа" передаецца пад кантроль Нацыянальнага банку, ці, інакш кажучы, нацыяналізуецца.



**ПАЭЗІЯ.** КГБ пасадзіў у свой сьледчы ізалятар у Менску вядомага беларускага паэта і журналіста Славаміра Адамовіча. Крымінальная справа ўзбуджаная за верш.

**ПРЭСА.** Пабачыў сьвет новы штомесячнік "Круг". Выданьне заснаванае Беларускім ПЭН-цэнтрам.

**ШПІЯНАЖ.** Улады Швэйцарыі выслалі з сваёй краіны першага сакратара расейскага пасольства, які быў злоўлены на шпіёнскай дзейнасьці.

**ЧАЛАБІТНАЯ.** Прэзыдэнт Беларускага Саюзу прадпрымальнікаў У.Карагін зьвярнуўся да А.Лукашэнкі з просьбай аб узнаўленьні рэгістрацыі прыватных фірмаў.

**УГОДКІ.** 11 красавіка споўнілася гадавіна зьбіцьця дэпутатаў апазыцыі былога ВС, якія праводзілі галадоўку прастэсту супраць рашэньня аб травеньскім рэфэрэндуме.

**НАРАДЗІНЫ.** Ажно чацьвёра дзяўчынак нарадзіліся за адзін раз ды ад адной жанчыны у Менскім абласным раддоме. Гэта першы такі выпадак прынамсі за апошнія пятнаццаць гадоў.

**ДЗЕЦІ.** У славутага караля футболу 56-гадовага Пэле нарадзіўся пяты дзіцёнак.

**СУД.** Распачаўся суд над Джуліё Андрэоці, які ажно сямёрачы быў прэм'ер-міністрам Італіі, а цяпер абвінавачваецца ў сувязях з мафіяй і дачыненьні да забойства ў 1979 г. журналіста, што хацеў вывесьці злодзеяў на чыстую ваду.

**ВАЙНА.** У чацьвер у Турцыі ўрадавыя сілы бясьпекі забілі 46 чалавек і страцілі трох сваіх падчас баёў з атрадамі курдаў, якія, як і чачэнцы, дамагаюцца незалежнасьці.

# Кансэрватыўны адказ

Усё, што адбываецца сёньня ў палітычнай сфэры — нетрывалае. Адзін з індыкатараў гэтага працэсу — немагчымасьць прадказаць разьвіцьцё падзеяў у найбліжэйшай будучыні. Між тым, глябальны прагноз зрабіць нескладана. Калі сказаць зусім проста — усё адно пераможа NATO. Любое блёкавае супрацьстаяньне, у якое захочацца пагуляцца Маскве й Менску, скончыцца чарговым распадам таталітарных сыстэмаў Усходу. Адна такая "халодная вайна" завяршылася на нашай памяці. Заходнія дэмакраты валодаюць несувымернымі з Расеяй эканамічнымі й інфармацыйнымі рэсурсамі. Захад зусім ня хоча ўцягвацца ў рэальнае ваеннае супрацьстаяньне. Такім чынам, мы можам весьці гаворку пра пэрспэктыву найменей дзесяцігадовую. Застаецца пытаньне — што адбудзецца ў гэтай храналягічнай шчыліне, у міжчасьсі? І гэта пытаньне нашае прыватнае пэрспэктывы — дзе мы будзем, што з намі будзе, як доўга?

Некаторыя аптымістычныя матывы прыхаваныя ў самых горшых і радыкальных варыянтах разьвіцьця падзеяў, што рыхтуе для нас чалавек, які праглынуў усю беларускую палітыку. Вось зьдзяйсьняецца чалавечая мара Аляксандра Лукашэнкі — ён перабіраецца ў Маскву. Ня выключана, што агульны клімат у Беларусі стане здаравейшы, нармалізуецца грамадзкае й культурнае жыцьцё. Заняты справамі дэградацыі Імпэрыі патрон, які паступова будзе набліжацца да свайго палітычнага скананьня, напросту фізычна ня здолее надаваць ранейшай увагі нялюбай ды замалай для яго краіне. Палітычна жыцьцё ў Беларусі прасьцейшае ня стане, але разам з Лукашэнкам зьедзе дэманізм, тая містычная рэальнасьць, што дэстабілізуе сёньня Беларусь і не дае ёй вырвацца з зачараванага кола.

А пакуль грамадзяне Беларусі рыхтуюцца да новай партызанкі. Ужо няма сэнсу ды магчымасьці сыходзіць у панішчаныя лясы. Новая партызанка будзе партызанкаю індустрыйнай эры. Асяродак змаганьня — не векавечныя дрэвы, а сілікатныя скрыні гарадзкіх дамоў. Сродкам супраціву будуць не збройныя акцыі, а эфэктыўная дзейнасьць незалежных установаў. Прыватныя і карпаратыўныя праекты таксама ня здолеюць пазьбегнуць траўмаў гістарычнага працэсу, але менавіта гэтыя праекты фармуюць арганічнае цела грамадзтва, таму яны — самая магутная зброя супраць таталітарнага рэжыму.

Пакуль адзін чалавек праз трансфармацыі цэлых дзяржаваў вырашае свае ўласныя справы, беларускае грамадзтва застаецца кансэрватыўным у прывязанасьці да свайго тапасу, да свайго аселага месца і мадэрнізуе традыцыйную форму сваёй устойлівасьці ў крызысных сытуацыях — індустрыйную партызанку.

Алег Дзярновіч

# "НАША МОЛАДЗЬ НЕ ПАВІННА ПАЙСЬЦІ Ў ЛЯСЫ"

Працяг са стар.1

**"НН": На Вашу думку, такая магчымасьць існуе?**

П.К.: Некаторыя заявы на мітынгах сьведчаць, што невялікая колькасьць радыкальна настроенай моладзі блізкая да гэтага.

**"НН": Вы прафэсійны палітык ад пачатку. Маеце вялікі палітычны капітал ня толькі ў Беларусі, але й за мяжой. Вашыя кантакты зь беларускай дыяспарай атрымалі шырокі розгалас... Якой Вам бачыцца Ваша палітычная будучыня?**

П.К. Маю будучыню вызначаюць лёс, падзеі, народ. Я перакананы, што, нягледзячы на розныя формы інтэграцыі, нягледзячы на тое, што нам, магчыма, давядзецца прайсьці праз этап канфэдэрацыі ці фэдэрацыі, мы ўсё ж будзем сувэрэннай дзяржавай. Яшчэ ў 92-м годзе я сказаў, што нам давядзецца прайсьці праз этап канфэдэрацыі. Не таму, што я зацікаўлены ў гэтым. Я сказаў гэта ў Нью-Ёрку эміграцыі. Спачатку ідзе адна хваля — хваля адраджэньня, станаўленьня дзяржаўнасьці. Потым хваля ідзе ў іншы бок...

**"НН": А наступная хваля?**

П.К.: Я думаю, што гэта будзе хваля нацыянальнага ўздыму. Моладзь — за адраджэньне. Нікуды не падзенесься. Я паважаю пэнсіянэраў, паважаю вэтэранаў. Дай Бог, каб мы, як дзяржава, зрабілі ўсё магчымае, каб палегчыць ім існаваньне ў цяперашніх гаротных умовах жыцьця. Але трэба думаць і пра моладзь, і разумець, што менавіта за ёю будучыня. Паглядзіце вынікі сацыялягічных апытаньняў. Кожны другі прадстаўнік моладзі ў Менску — за незалежнасьць, сувэрэнітэт. Кожны другі! 36% менчукоў адназначна выказваюцца за незалежнасьць і сувэрэнітэт, а моладзь — болей за 50%. Гэта вынікі апытаньня, якое праводзілі расейскія сацыялягічныя службы, тое, што апублікавана ў "Комсомольской правде".

Паглядзіце, хто прыходзіць на мітынгі, хто выступае за нацыянальную сымболіку, зьвярніце ўвагу, якая сымболіка была падчас футбольнага мачу зборных Беларусі і Галяндыі. 50-тысячны стадыён быў напоўнены хваляй гэтай сымболікі... Таму, вяртаючыся да Вашага пытаньня,... ня ведаю, які мой лёс. Адзінае магу сказаць, што я быў, ёсьць і застануся на сваіх пазыцыях. Я палітык, я ўлічваю рэаліі палітычнага жыцьця і неабходнасьць эканамічнай інтэграцыі з Расеяй, я перакананы, што тут у нас няма альтэрнатывы. Трэба ўлічваць і рэаліі таго, што адбылося цяпер, але спакойна, нармальна працаваць дзеля будучыні Беларусі. Да прыкладу, тры гады я займаюся канкрэтным праектам, які значыць зусім ня менш, чым некалькі мітынгаў. Я маю на ўвазе ўшанаваньне памяці Міхала Агінскага ў Італіі...

*ДАВЕДКА "НН": 2 красавіка на запрашэньне мэра Флярэнцыі беларуская дэлегацыя на чале з П.Краўчанкам наведала Нацыянальны Пантэон, дзе спачывае прах нашага земляка, выдатнага кампазытара, дыплямата, гісторыка й грамадзкага дзеяча Міхала Агінскага. У Пантэоне адбыўся канцэрт з твораў Агінскага, прагучаў і славуты паланэз "Разьвітаньне з Радзімай". У той самы дзень на доме, дзе жыў апошнія свае дзесяць гадоў Агінскі, была адкрытая мэмарыяльная табліца.*

**"НН": Якую ролю ў палітычным жыцьці краіны Вы, сябра Беларускай Сацыял-Дэмакратычнай Грамады, адводзіце БСДГ?**

П.К.: Я лічыў і лічу, што гэта — адна зь нямногіх гістарычных партыяў у Беларусі. Яна будзе трансфармавацца, разьвівацца, набываць сваё сучаснае аблічча, але самае галоўнае, каб яна ня страціла тыя карані і нацыянальныя традыцыі, якія ў яе былі. Калі ў Грамадзе будзе больш вядомых палітыкаў, пісьменьнікаў, навукова-тэхнічных работнікаў, рабочых, — я думаю, што аўтарытэт гэтай партыі аб'ектыўна будзе ўзрастаць. Я лічу, што гэта ўвогуле адна зь нешматлікіх пэрспэктыўных партыяў. Пры ўсёй павазе да лібэралаў, да кансэрватараў, людзей, якія выступаюць за рынкавую эканоміку, іх час прыйдзе значна пазьней, праз многія дзесяцігодзьдзі. Ня хутка прыйдзе посьпех і масавы характар і да сацыял-дэмакратычнай партыі. Але трэба працаваць. Калі сацыял-дэмакратычная партыя будзе з аднаго боку бараніць інтарэсы рабочых, а з другога боку ня будзе забываць пра нацыянальныя традыцыі і падыходы, то яна можа пераўтварыцца ў масавую партыю. Таму што гэтая партыя не панесла такія цяжкія страты, як іншыя. Яна можа трансфармавацца, набыць сучасны імідж, набыць велізарную ролю ў Беларусі.

**"НН": Беларуская эміграцыя. Лукашэнка некалькімі сваімі выказваньнямі літаральна адсек яе ад Беларусі. Вы добра ведаеце беларускую эміграцыю. Скажыце, калі ласка, якім чынам яна можа паўплываць на палітычнае жыцьцё Беларусі?**

П.К.: На вялікі жаль, я амаль ня бачу такіх магчымасьцяў. Абсалютная большасьць эмігрантаў — гэта добрыя, шчырыя людзі, патрыёты Беларусі, але ў іх вельмі абмежаваныя магчымасьці. У адрозьненьне ад тых самых украінцаў, якія маюць трох сваіх дэпутатаў у Кангрэсе ЗША, яны ня могуць мець моцнага палітычнага ўплыву, ня могуць лябіраваць. І эканамічныя магчымасьці ў іх абмежаваныя, бо наша эміграцыя — гэта пераважна працоўная эміграцыя. Яны сочаць за падзеямі, хвалююцца, радуюцца посьпехам, якія адбываюцца ў Беларусі. Але... перш за ўсё трэба разьлічваць на патэнцыял людзей тут, на месцы.

"Наша Ніва"
незалежны тыднёвік
НАША НІВА
заснаваны ў 1906,
адноўлены ў 1991

| | |
|---|---|
| заснавальнік і выдавец рэдактар | Павал Жук |
| адказны сакратар | Сяргей Дубавец |
| мастацкі рэдактар | Алег Дзярновіч |
| навіны | Сяргей Харэўскі |
| рэдактар дадатку "Інфарматар" | Уладзімер Бараніч |
| макет | Андрэй Лапцёнак |
| мантаж | Віктар Корзун |
| набор | Лявон Раманчык |
| стыліст | Тацяна Чуйвід |
| карэктура | Антон Кузьміч |
| пры ўдзеле | Сяргей Смятрычэнка |
| | Сяргея Шупы |
| прадстаўнік рэдакцыі ў Гомелі (тэл. 56-94-36) | Зьміцер Бартосік |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ**
**220123 Менск, а/с 71** Тэл./факс 36-76-75
**Падпісны індэкс 63125**

# 200 гадоў змаганьня за Канстытуцыю

Апошнім часам з вуснаў беларускіх палітыкаў часта зьлятаюць словы пра пагрозу экстрэмізму ў краіне. Гавораць пра "лясы", згадваюць партызанку мінулай вайны, Ірляндыю... Шматлікія блёк-пасты з аўтаматчыкамі на беларускіх дарогах, газ і дубінкі спэцназу ў часе мітынгаў, бязьмерна разьдзьмутая асабістая ахова прэзыдэнта, таблічкі "Побач з будынкам праход забаронены" каля адміністрацыі — усё гэта таксама не пасяляе ў душы спакою. Урэшце і заклікі "Не дапусьціць крыві!" або "Захаваць грамадзянскі мір!" ні пра што добрае ня сьведчаць. Ствараецца ўражаньне, што нехта наўмысна нагнятае напружанасьць у грамадзтве, якое зусім ня схільнае да экстрэмізму.

Адкуль жа бачаць пагрозу палітыкі? Чым можа быць выкліканы, чый і які можа стаць (калі можа) тэрарызм у Беларусі?

Калі браць палітычную апазыцыю, то яна бясконца заклікае "не паддавацца на правакацыі". Афармленыя экстрэмісцкія суполкі, накшталт расейскіх баркашоўцаў, занадта маргінальныя і наўрад ці маюць пэрспэктыву росту. Рашуча настроеная моладзь сёньня — некіравальная стыхія. Яе лёзунгі — Канстытуцыя, Дзяржава, Незалежнасьць. А радыкальныя дзеяньні ў абарону Канстытуцыі і законнасьці, накіраваныя супраць тых, хто гэтую Канстытуцыю і законы парушае, ці гэта — тэрор? І калі не тэрор, то што?

Калі напрыканцы 80-х мы глядзелі ў тэлевізіі, як разгортваюцца падзеі ў Румыніі, нам хацелася абстрагавацца, вытлумачыць усё гэта паўднёвай мэнтальнасьцю. Румынскія камуністы ў адказ на падзеі ва Ўсходняй Эўропе справакавалі крывавыя міжэтнічныя сутыкненьні ў Тэмішаары, прычым паліцыя была на баку пагромшчыкаў. Пасьля нацкавалі шахцёраў і рабочых на студэнтаў і лібэралаў. Мінула колькі месяцаў, і румыны з вугорцамі і славянамі, рабочыя з інтэлігентамі, шахцёры са студэнтамі разам перавярнулі дагары нагамі камуністычны рэжым. Дыктатар са сваёй камарыльляй быў расстраляны.

Тады беларусы казалі: "Мы — не Румынія, у нас шлях Чэхаславаччыны". БНФ клікаў да спакою, казаў пра "здаровыя сілы ў партыі"... Мінулі гады. Румынія ўжо амаль забылася на свайго камуністычнага Дракулу, засталіся ззаду і горыч вугорскіх пагромаў у Трансыльваніі, і крывавыя бойкі з "простымі" людзьмі, і драматычны й дыскамфортны працэс эканамічных рэформаў. У выніку румыны захавалі поўны сувэрэнітэт і тэрытарыяльную цэльнасьць, пазьбеглі грамадзянскай вайны, а злачынцы-камуністы сядзяць у вязьніцах. Сёньня пра Румынію ўжо амаль ня пішуць. Як і пра Славенію, Вугоршчыну, Альбанію... Там усё пайшло сваім чынам. Як сказаў адзін амэрыканскі бізнэсмэн, камэнтуючы падзеі, зьвязаныя з адхіленьнем літоўскага прэм'ера Шляжавічуса ад пасады: "Я не ўкладаю грошы ў краіну, пра якую пішуць у газэтах".

Сёньня ў газэтах пішуць пра Беларусь, Расею, Руанду, Палестыну, Босьнію, Кітай.

Распад вытворчасьці і яе ўздаражаньне, занядбаньне асноўных фондаў, зьніжэньне навукаёмкасьці і заняпад навукі робяць беларускую эканоміку неканкурэнцыйнаю. Адсутнасьць рэформаў у рынкавым накірунку не дае магчымасьці разьвіваць недзяржаўныя формы ўласнасьці і ствараць на іх глебе дадатковыя працоўныя месцы. Як вынік, беспрацоўе можа толькі нарастаць, бо пра новыя месцы ў дзяржсэктары нават гутаркі не вядзецца, а тыя, хто мае працу, чапляюцца за яе нават ужо ў пэнсійным узросьце, бо маюць падставы для даплатаў.

Моладзь, якая за апошнія гады ўваходзіла ў самастойнае жыцьцё, незапатрабаваная на вытворчасьці нават з адукацыяй. Як маладому чалавеку, да прыкладу, вырашыць жыльлёвую праблему? Дзе і як трэба працаваць? Ад каго і чаго чакаць? Дзяржаўныя магчымасьці сацыяльнае апекі мізэрныя і адстаюць ад інфляцыі й новых праблемаў. Самім заняцца бізнэсам малаверагодна, бо перадусім патрэбны пачатковы капітал. Яго няма, як няма і магчымасьцяў атрымаць прымальную пазыку. У такой сытуацыі масавы распад маладых сем'яў натуральны. Нават сям'я на сёньня перастае быць фундамэнтальнаю каштоўнасьцю. Што датычыць іншых каштоўнасьцяў, то гэта наагул цяжкавызначальныя рэчы для маладых. Паўсапраўдная дзяржаўнасьць? Паўжывая культура? Агульначалавечыя каштоўнасьці? Калі няма дзе жыць, за што карміць дзяцей, калі ўласныя пляны абломваюцца разам з чарговым выгнаньнем дзяржаўнае дактрыны і малады чалавек, які можа лепшыя свае гады пражыў пад іншым сьцягам, гатовы да радыкальных мераў. Можна пакідаць краіну, але нават для гэтага патрэбныя сродкі і адукацыйны цэнз. Большасьць застанецца.

Беспакаранасьць забойцаў Арцымені, Лісьнічука ды іншых дэманструе няздатнасьць і бездапаможнасьць вышуку. Тая палітыка, якую праводзіць сёньняшні рэжым у дачыненьні да апазыцыі, выклікае рост недаверу. Калі расейскія, польскія ды іншыя СМІ перадаюць аб'ектыўную інфармацыю пра палітычную сытуацыю ў краіне, а лукашэнкавы СМІ груба й несхавана хлусяць, для народу гэта азначае, што яму могуць хлусіць і ў астатнім. Калі ніхто ў кра-

іне ня ведае, што за дакумэнты падпісвае Лукашэнка ў Маскве — гэта азначае, што Лукашэнка не давярае сваёй нацыі, нават іншым галінам улады.

Усё гэта сьведчыць пра тое, што калі ў Беларусі і магчымы экстрэмізм, пра які гавораць палітыкі, то толькі экстрэмізм, справакаваны паводзінамі рэжыму, экстрэмізм у абарону закону.

Наш Асноўны Закон дае магчымасьць для легальнае апазыцыі, для альтэрнатыўных рухаў, для любой асобы свабодна даносіць сваю думку да іншых. Той статус, які паводле Канстытуцыі мае наша дзяржава, сёньня мог бы зрабіць Беларусь гарантам стабільнасьці ў рэгіёне. Тыя правы, якія цяпер паводле Канстытуцыі мае грамадзянін Беларусі, маглі б стаць гарантам будучыні ягоных дзяцей. Аднак сёньня гэтая Канстытуцыя пад пагрозай. Яе галоўным ворагам стаў той, хто на ёй прысягаў.

Тое, за што змагаліся пакаленьні эўрапейцаў — Закон як асноватворчую сілу нацыянальнай дзяржавы і яе дачыненьняў са сьветам, сёньня ў нас могуць адабраць гэтаксама, як ужо адабралі мову. Атрымліваецца, што тыя, хто гатовы заўтра да супраціву, будуць адстойваць Канстытуцыю, а зь ёй і свае правы і свабоду. Апошнія 200 гадоў беларускай гісторыі ведаюць такую традыцыю. Два стагодзьдзі змаганьня за Канстытуцыю.

Сяргей Баркоўскі

## Краіна за тыдзень...

**БЭНЗЫН.** Адбылося чарговае падвышэнне коштаў на нафтапрадукты. З 1-га красавіка ўзьняліся камэрцыйныя цэны на аўтабэнзын і дызэльнае паліва. Для прамысловасьці: на бэнзін А-76 — на 9,9%, АІ-92 — на 20,4%, на дызэльнае паліва на 3,2%. Для сельскай гаспадаркі: А-76 — на 20,9%, АІ-92 — на 32,5%, на дызельнае паліва — на 13,5%. На аўтазапраўчных станцыях кошты таксама выраслі: А-76 — на 11-18%, АІ-92 — на 20,6%, дызэльнае паліва — на 10%. У Менску на аўтазапраўках кошт паліва за літар склаў: А-76 — 2800 руб., АІ-93 — 3200 руб., АІ-95 — 4000 руб., АІ-4400 руб., дызэльнае паліва — 2200 руб.

**ЗАРОБКІ.** За такім падвышэньнем цэнаў простым людцам ня ўгнацца. Сярэднемесяцовая зарплата рабочых, службоўцаў і калгасьнікаў у Беларусі склала 983 тыс. руб. Такую лічбу прывяло Міністэрства статыстыкі і аналізу. У той жа час мінімальны спажывецкі бюджэт быў вылічаны як 924 руб. на аднаго сямейніка. Мінімальны спажывецкі кошык для малазабясьпечаных склаў 527 тыс. 34 руб. на чалавека. Паводле афіцыйных дадзеных за рысай беднасьці апынуліся працаўнікі сельскай і лясной гаспадаркі, гандлю, аховы здароўя, сацыяльнага забесьпячэньня, культуры, адукацыі і мастацтва. Паводле зьвестак Дзяржкамстату сёньня ў краіне зарэгістравана 157 тыс. беспрацоўных. Міністар працы А.Сасноў кажа, што паралельна існуе прыхаванае беспрацоўе недзе на ўзроўні 14% усяго працаздольнага насельніцтва.

**БАНК.** Укладчыкам ды акцыянэрам "Магнатбанку" да галаўнога болю ад росту цэнаў дадалася яшчэ занепакоенасьць пра лёс іхных грошай. Сёньня гэты банк апынуўся ў крытычным фінансавым становішчы. Для вырашэньня далейшага лёсу "Магнатбанку" створана адмысловая камісія на чале з намесьнікам старшыні праўленьня Нацбанку. Менскі абласны гаспадарчы суд рыхтуе да разгляду судовую справу аб прызнаньні БелАКБ "Магнатбанк" эканамічна неплацёжаздольным. Чакаецца, што пасьля рашэньня суда, першае паседжаньне якога заплянавана на 17 красавіка, банк будзе прызнаны банкрутам, і яго ліквідацыяй зоймецца адпаведная камісія.

**ПРАЯЗНЫЯ.** Беларуская чыгунка ўвяла тры віды праязных квіткоў для прыгарадных цягнікоў. Гэта імянны праязны квіток, квіток "выходнага дня" і звычайны квіток. Імянны (з указаннем прозьвішча ўладальніка) дае права на паездку да ўказаных станцыяў і набываецца на адзін ці некалькі месяцаў. Каштуе такі квіток 5-6 паездак у абодва канцы. Квіток "выходнага дня" выпісваецца для праезду туды-назад у межах вызначанай зоны і сапраўдны ў выходныя, пятніцы, панядзелкі, перадсьвяточныя й сьвяточныя дні. Ягоны кошт вызначаецца з разьліку чатырох паездак у абодва бакі. Звычайны праязны дзейнічае ў межах вызначаных зонаў ва ўсе дні тыдня. Каштуе ён 22-24 паездкі.

**ПАГРОЗА.** Беларускія ўлады сур'ёзна заняліся абаронай інтарэсаў Расеі. У бок суседняй нам Польшчы былі выказаныя нежартоўныя пагрозы наконт яе магчымага далучэння да блёку NATO. Міністар абароны Беларусі Леанід Мальцаў заявіў агенцтву "Інтэрфакс-Захад", што "Рэспубліка Беларусь вымушана будзе адказаць на гэта адпаведнымі мерамі, як палітычнымі так і ваеннымі". У якасьці крайняй меры ўзьдзеяньня на Польшчу генэрал назваў магчымую перадыслякацыю ўзброеных сілаў да беларуска-польскай мяжы. Пра сілы якой краіны ідзе гутарка, не ўдакладнялася.

**ПАВОДКА.** У Беларусі распачалася бітва зь лёдам і вадою. На лініі абароны знаходзяцца 29 падрыўных камандаў, што ўкамплектаваныя плаваньнымі транспартэрамі ды гусянічнай тэхнікай. На чатырох вайскова-паветраных аэрадромах стала дзяжураць па адным шрубалёце МІ-8. Для стральбы па ледзяных супастатах ёсьць нават мінамёты. Выбухі грымяць на ўсіх буйных рэках у месцах нагрувашчваньня лёду каля апораў мастоў. Пра што звычайна не паведамляецца ў афіцыйных зводках зь "лядовых пабоішчаў", дык гэта пра іншыя выбухі. Глушаць рыбу. Маючы легальны дазвол на выкарыстаньне тонаў выбухоўкі, шмат дзе падрыўнікі атрымваюць някепскі ўлоў. У гэтым можна пераканацца, наведаўшы, скажам, тую ж менскую Камароўку, дзе апошнімі днямі зьявіўся неверагодна вялікі выбар рачной рыбы.

*Андрэй Дынько*

# АЛАХ АКБАР

## Інтэрвію з тэрарыстамі

### 1. "Зазірнуць за прызму вайны"

Чачэнская прымаўка вучыць: "Перш, чым спытаць, падумай, можа, сам здагадаесься; глядзі, каб вецер лішнія словы не панёс". Зрэшты, наўрад ці гэта прымаўка, бо параўнаньне досыць нязграбнае. Проста, такі выраз быў ужыты адным з тых, з кім я сустрэўся на ўтульнай карпацкай турбазе. Калі б не абяцаньне прывезьці матэрыял — шык сэзону, якое я, перакуліўшы з холаду чарку "Белавескай", даў аднаму са сваіх рэдактараў, я наўрад ці здолеў бы задаць столькі балючых для маіх суразмоўцаў пытаньняў і давесьці да канца гэтае інтэрвію. Але наколькі цяжка было браць інтэрвію, настолькі цяпер я не магу адарвацца ад магнітафону. Ужо чацьвертая гадзіна ночы. А сёмай я ад'яджджаю ў Горадню, там трэба будзе перакладаць міністру прамысловасьці. Хоць бы не заснуць на перамовах...

У прынцыпе, усё пачалося зь сястры: яна, як добрая дурніца, паехала нібыта да знаёмых у Чачэнію. Богудзякаваць, праз тры тыдні вярнулася жывая і амаль нічога страшнага там ня бачыла. Аднак, пасьля яе вяртаньня чачэнская тэма стала суправаджаць нас. Сястра цяпер пазнае чачэнцаў з аблічча, і іншы раз нават вітаецца зь імі на вуліцы. Яны ў такіх выпадках заўсёды бянтэжацца.

Шаміль, Руслан, Салам і Алекс, — чацьвёра баевікоў, тэрарыстаў, партызанаў, маджахедаў, змагароў, бандытаў, — таксама бянтэжыліся, гутарачы са мною, губляліся пры кожным нечаканым пытаньні, хаця мелі за плячыма не адзін дзясятак баёў; яны забівалі і дабівалі; у іх на вачох канялі іхныя таварышы; Руслан быў сьведкам таго, як гарэў ягоны дом; Салам выцягваў з-пад рэштак бліндажыка парэшткі сваёй бабулі (дакладнае пападаньне бомбы), а на Алекса паляваў расейскі шрубалёт. Паводле ягоных словаў, гэта адбывалася прыкладна так, як у адным зь фільмаў пра Джэймса Бонда: у стужцы шпіён хаваецца ад шрубалёту за камянямі, перабягаючы ад валуна да валуна, на фоне непаўторнага харвацкага пэйзажу... Гледзячы кінакадры, мы часта лічым, што пэўныя трукі ў рэальным жыцьці немагчымыя. Пасьля гутаркі з чатырма хлопцамі ў засьнежаным Ярэмчы я шмат чаму стаў верыць. Апроч таго, я зразумеў, чаму Сьвятлана Алексіевіч, напісаўшы пра цынкавых хлопчыкаў і чарнобыльцаў, адмовілася ехаць пісаць пра Чачэнію і заракліся кранаць ваенную тэму наагул.

Алекс і Салам — нэрвовыя; вочы Шаміля і Руслана часам сарамліва апускаліся долу. Гэтыя чатыры хлопцы — тады зь імі быў яшчэ пяты, Хасанбэк, ён ужо, спамяні яго Божа, нежывы, — учынілі такое, з чым мы, сучасныя эўрапейцы, сутыкаемся хіба што ў працах Фройда, чаго мы нясьведама і беспадстаўна баімся ў дзяцінстве: яны кастрыравалі двух палонных расейскіх кантрактнікаў-наёмнікаў.

Алексу і Саламу па 26 гадоў; яны здаўна ведаюць адзін аднаго, разам служылі ў Разанскай паветрана-дэсантнай дывізіі. Алекс — расеец, родам з Санкт-Пецярбургу. Шамілю — 23, ён не пасьпеў скончыць V курс Пецярбурскага інстытуту замежных моваў, і, ведаючы, агульны ўзровень гэтай навучальнай установы, не магу не ацаніць ягоных здольнасьцяў. Калі ён дазнаўся, што раманістыка — мая першая спэцыяльнасьць, як заўжды ў гутарках мовазнаўцы з мовазнаўцам, ён раз-пораз устаўляў францускія слоўцы. Пра Руслана ён выказваўся фразай зь ін'язаўскай праграмы трэцяга году навучаньня. "C'est le benjamin de notre groupe"[1]. Руслану — 20, але ён выглядае на болей. Увогуле, каўказцы сталеюць рана.



Мая авантура пачалася з Кіеву, і, як "Майстар і Маргарыта", з Аскольдавае гары. Мы зь сястрою снаўдаліся па старым "цвынтары", то бок могілках, што захаваліся на самай старажытнай з кіеўскіх гораў, дзе цяпер, — чуў, — па начах зьбіраюцца сатаністы. (І, праўда, там сярод зімы былі сьвежавыкапаныя ямы.) Мы спрабавалі вызначыць магілы кіеўскіх студэнтаў, што палеглі ў 1918 годзе ў першым жа баі, пад Крутамі, абараняючы ад бальшавікоў незалежнасьць "бесталаннае" Украінскае Народнае Рэспублікі. Пакуль я зазіраў у нейкую "старовинную"[2] каплічку, мая сястра распачала гутарку з маладым чачэнцам, які сваімі яснымі вачыма і адкрытым тварам чамусьці здаўся мне вылітым Фабрысам дэль Донга з "Chartreuse de Parme"[3]. Тады я ня чуў пачатку гутаркі. Цяпер, па вяртаньні зь Ярэмча, я пацікавіўся ў сястры. Яна ўзгадала, што Шаміль ня надта ласкава азваўся на яе "Алах акбар". Аказалася, што ён перад гэтым якраз быў у Менску. Нягледзячы на стрыманасьць Шаміля, мы спусьціліся на Андрэеўскі ўзвоз разам і гулялі па Кіеве даволі доўга.

Тады нарадзілася пачуцьцё няёмкасьці, якое суправаджае мяне да сёньня. Я пачуваўся ў такой кампаніі даволі няўтульна: побач са мной крочылі людзі, якія даказалі сваю гатоўнасьць ахвяраваць жыцьцём за свабоду, а я? Да найбольш рызыкоўных хвілінаў майго сытага існаваньня можна аднесьці хіба што палёты на самалётах беларускіх авіякампаніяў ды спробу (няўдалую, дарэчы) пакоўзацца, нападпітку і напад'едку, на водных лыжах па імклівай рэчцы По. Пад канец Шаміль быў прапанаваў нам ехаць разам зь ім у Ярэмча, дзе меўся адпачываць. Сястра ветліва адмовілася, сьцягнуўшы пальчатку з правай рукі, на якой яна носіць заручальны пярсьцёнак.

Наступным днём сястра зьехала ў Менск, а я пайшоў у госьці, на каву да "масонаў", як называюць у Кіеве ўкраінскіх эмігрантаў, што наяжджаюць з Амэрыкі ды Канады дапамагаць бацькаўшчыне. Масоны здымалі кватэру ў Лыпках, фэшэнэбэльным кіеўскім квартале; стаяла лютаўская імгла; я раяваў, трускаючы варэнікі з кавай. І калі мне распавядалі пра тое, як арганізоўваецца адпачынак для чачэнцаў (а няма такога ўкраінца, які б хоць у нечым, ды ня браў удзелу), і што, у прыватнасьці, учора чатырох выправілі ў Ярэмча, я, са сваім дурным жаданьнем рабіць на людзей уражаньне, рызыкнуў адгадаць: "Я ведаю аднаго зь іх, Шаміля, гэтак падобнага на marchesino[4] па ўцёках з Пармскай цытадэлі".

Я ўразіў ня так знаёмствам з адным з звышсакрэтных гасьцей Украіны, як таямнічым для маіх прыяцеляў параўнаньнем. Зьвестка, што мая сястра летась, неўзабаве пасьля таго, як Шаміль Басаеў са сваімі ваякамі дзеля міру захапіў горад Будзёнаўск, пабывала ў Ведзяно, чачэнскім фарпосьце, расчульвае ўсіх на сьвеце. Украінцы сталі вымалёўваць мне гераізм (о, каб яны ведалі ўсё!) гэтай чацьвёркі, а ў мяне нарадзіўся плян, як пераплюнуць усіх прыяцеляў, што крэмзаюць постмадэрнісцкія эсэ ці клясычныя санэты і напісаць "Інтэрвію з тэрарыстамі" ў галівудзкім стылі. Спрычынілася й сястра з уласьцівым ёй невычэрпным энтузіязмам: "Андрэю, ты мусіш зрабіць гэта!" Яна асабіста тэлефанавала ў Ярэмча. Халера яе ведае, як яна там дамовілася, каб са мной згадзіліся сустрэцца. На 8 сакавіка я па-самахвальску выправіўся ў дарогу.

У цягніку мяне апанаваў пэўны атавістычны жах. Са сваім комплексам непаўнавартасьці, спароджаным яшчэ ў дзяцінстве з-за таго, што Бог даў мне высокі і мяккі голас, — зразумеў я, — поруч з суворымі горцамі, пад позіркам іх арліных вачэй, я буду адчуваць сябе смаркачом, чатырнаццацігадовым хлапчуком перад васемнаццацігадовымі. Да таго ж размаўляць нам прыйдзецца па-расейску. Стаўленьне чачэнцаў да расейскай мовы цяпер мае быць адпаведнае. Тымчасам стары гуцул, фэрмэр з-пад Каламыі, мой спадарожнік, частаваў мяне салам і брынзай. Усё нагадвала мне шостую клясу, калі я вяртаўся з тае ж Ярэмчы, з турбазы "Гуцульшчына" са спартовых спаборніцтваў.

На вакзале мяне сустракаў Шаміль. У вайны не чачэнскае аблічча, — падумаў я, здароўкаючыся зь ім і зазіраючы ў сьветлыя, як вада ў вадаспадах на рэчцы Прут, вочы.

— Какого х... ты прие...? — спытаў ён, не зварухнуўшы здрадніцкай яснасьці крышталю.

Мэту вандроўкі я сфармуляваў сабе яшчэ ў цягніку: "Зазірнуць за прызму вайны". Вось чаму я азваўся: "Алах акбар".

Пра іх асноўныя ўчынкі я даведаўся таго ж вечара. Мяне ахапіла пачуцьцё, знаёмае маніфэстанту, на якога мкне гурма чорных шаломаў, узброеных шчытамі і дубінкамі, — пачуцьцё панікі. Тым ня менш, абяцаньне сябрам было дадзенае, і я ня меў права зьбегчы першым цягніком. Перад тым, як пайсьці спаць, я стаяў перад люстрам, спусьціўшы майткі, і па-філязофску разважаў, як гэта ўвогуле можа адбывацца.

Працяг на старонцы 4

# АЛАХ АКБАР

Працяг са стар.3

Заўтра я меўся лезьці гэтым дзецюкам у душу. Мне было боязна. У нас тых, хто хоча ведаць зашмат, часам могуць і забіць. Вось жа я мусіў дазнацца: чаму? Трэба меркаваць, з-за помсты, але чаму менавіта такая помста? Начуючы ў Ярэмчы, я прысьніў кроў. Нібыта я сыходзіў крывёю, молячы чачэнцаў расказаць хоць нешта, а яны зацята маўчалі, гледзячы ў неба.

## 2. Салам

Я паразмаўляў з кожным па чарзе і быў трохі зьдзіўлены тым, што хлопцы не хаваліся ў маўчаньні, але, у пэўныя моманты, нават імкнуліся выгаварыцца. Вось Салам; поўнае імя, напэўна, Саламбэк, нэрвовы. Часта паліць. Чамусьці цыгарэты з мэнтолам. Пры мне не ўжываў брыдкіх словаў. На руцэ, ля локця, вялікі барвовы шнар. Салам між чатырох быццам старшыня.

– Ты шмат чалавек забіў?
– Чатыры ворагі.
– Усе салдаты?
– Тры афіцэры. Чацьвёртага добра ня бачыў. Алах скажа.
– Страшна забіць чалавека?
– Я забіваў не людзей, а ворагаў.
– Яны ж таксама людзі.
– Я іх у госьці ня клікаў.
– Ты даўно ваюеш?
– Ад пачатку.
– Ты служыў у войску, ці ўзяўся за зброю, калі рушылі расейскія войскі?
– Як Грозны аблажылі, я пайшоў ваяваць. У першы дзень, як ваяваў, забіў двух расейцаў; болей так ні разу не шанцавала.
– Гэта вялікая ўдача – забіць расейскага салдата?
– Салдата – не, афіцэра – так.
– Прабач, ня ведаю Карану, але, я думаю, любая рэлігія кажа, як мая хрысьціянская: "не забі".
– Я ваюю з тымі, хто ня верыць у Бога; два трупы бачыў, на іх не было крыжыкаў.
– А верыш у Бога?
– Калі б ня верыў, не ваяваў бы.

Страляючы, Салам цаляе ў жывот, як вучылі ў войску. "Галоўнае – не куды, галоўнае – каб рука не дрыжала. Расейцы, каб не баяцца, пьюць гарэлку". Ён ня п'е перад боем. У яго рукі ніколі не дрыжаць. Значыць, яму няма ў чым каяцца. Азрозьненьне між Алексам і іншымі расейцамі? Алекс ганарлівы, годны і вольны, а тыя, хто скідаў бомбы на Грозны – набрыдзь, гатовая труціць, паліць і рэзаць. Калі Салам і Алекс служылі разам, аднойчы пахварэлі ўсе кухары, і Алекса паставілі дзяжурыць на кухні. Увечары прыпёрся афіцэр, набрынялы расейскай тугою, і загадаў зварыць сабе кавы. Алекс наліў кавы, але афіцэру яна здалася занадта халоднай, і ён, выплеснуўшы жыжку на падлогу, даў піцерцу добрага таўхуна. Ты што, маўляў, баран, ня чуў загаду: "зварыць". Алекс палічыў афіцэру зубы, бо крыўды ня церпіць і добра ўмее біцца. Пасьля афіцэр прабачаўся, каб замяць скандал, баючыся вылецець з прэстыжнай дывізіі. Пазьней афіцэр і Алекс пасябравалі.

... Пра тых салдатаў распавядаў неахвотна. "Яны згвалцілі дзяўчыну зь селішча Хасанбэка, яны прыехалі ў маю краіну, каб забіваць, кідаць бомбы, паліць, секчы нашыя дрэвы, забруджваць ручаі, зь якіх мы бярэм ваду".

Амаль нічога не распавёў пра сваю сям'ю. Я не наважыўся спытаць, ці дзяўчына была нявестай Салама. У ім адчуваюцца вялікія прынцыпы, унутраная напятасьць і разьвітае пачуцьцё доўгу. Ён – першы чачэнец, зь якім я грунтоўна паразмаўляў, і ён адразу стаў для мяне стэрэатыпам чачэнца.

## 3. Алекс

– Алекс, гэтая дзяўчына была нявестай Салама?
– Не, настаўніцай.
– ...
– Настаўніцай, расейкай.

Папера – не магнітная стужка, але й добра, што нашыя інтанацыі не гучаць на паперы. Жорсткасьць таго, што робіцца на сьвеце за чатыры гады да трэцяга тысячагодзьдзя ад нараджэньня Хрыстова, лягчэй перадаць сухімі фразамі, запячатанымі ў стандартную сынтаксычную абалонку, чым інтанацыямі. Вядома, мае суразмоўцы ўжывалі іншыя словы, і амаль кожная рэпліка чаргавалася з паўзай: хвіліны маўчаньня пасьля хвілінаў бязглузьдзіцы. Я прывез дадому сем касэтаў. Узяў бы болей – прывез бы больш дыялёгаў. Кроў, якую я сьніў ноччу, выела ўсе паэтычныя эмоцыі. Я проста дапытваўся.

Алекс з Санкт-Пецярбургу, жыве побач са славутай турмой "Кресты". Жанаты. Жонка працуе сакратаркай у прыватнай фірме. З жонкаю жыў кепска. Сварыўся. Пакінуў ёй кватэру (былая камуналка, засталася ад бацькоў) і паехаў у Чачэнію да Салама. Мае сына. Барысік вучыцца чытаць па цыдулках, якія вязьні з Крастоўскай турмы шпуляюць за муры. Мабыць, такі рытуал. Уся вуліца засеяная абрыўкамі паперы, згорнутымі ў малюпасенькія кулёчкі і зьлепленымі мякішам.

Алекс сумуе па шапаценьні гэтых паперак пад нагамі; ужо раніцай, калі ідзеш на працу да мэтро, цыдулкі нагадваюць, што табе ня горш за ўсіх жывецца, што існуюць злодзеі, зло ў сваім клясычным выглядзе, бясспрэчнае, несумненнае зло, зь якім лёгка змагацца.

Дзяўчына-настаўніца жывая. Яна зьехала. Пра Салама:

– Наўрад ці Салам расказаў табе, што бомба трапіла ў бліндажык, дзе хавалася ягоная бабуля. Чачэнцы маўклівыя, не распавядаюць пра гора. Салам сам выкапаў гэты бліндажык. Бабулі было 76. Яна заўсёды надзявала чорныя хусткі з махрамі... Туды трапіла бомба, дык знайшлі шмат жалезных аскепкаў. Разумееш, Андрэй, бабуля ўсё чакала, калі Салам ажэніцца, калі будзе вясельле. Цяпер у іхнай хаце абшарпаныя муры і выбітыя шыбы, а поле ўсё стапталі. Кажуць, што чачэнцы – тэрарысты. Бабулі было 76, якая зь яе тэрарыстка? Салам прыяжджаў да мяне ў Піцер (мы круцілі там пэўныя справы). Ён купляў ёй насеньне кветак. Аднойчы вёз ёй нейкія калівы ажно з Таліну. Мы не зрабілі нічога дрэннага тым салдатам. Мы зрабілі тое, што яны заслугоўвалі.

Алексу ня страшна сярод чачэнцаў, ня страшна, што нехта зь іх не разьбярэ і... У Чачэніі Алекс носіць зялёную стужку на шапцы, калі ідзе ў бой. Калі б ён быў у Пецярбурзе, ён меў бы болей шанцаў, што нейкі алькаголік не разьбярэ і... Алекс любіць чачэнцаў. Неяк ён цікавіўся дзэн-будызмам, дык, мусіць, у папярэднім жыцьці ён жыў недзе там, у гарах. Яшчэ ў войску, упершыню ўбачыўшы чачэнскія танцы, зразумеў: гэта – ягонае. У іхнай вайсковай частцы было шмат чачэнцаў; яны бралі зэдлікі з кухні, ішлі за кутук казармы, і з адчайнай строгасьцю танцавалі. Але Алекс яшчэ не навучыўся танцаваць па-чачэнску.



Яму ня страшна за сына, хоць тых двух палонных яны адпусьцілі. Алекс "ні храна" не баіцца помсты. Вайна пачынаецца раптоўна, але заглухае цягам дзесяцігодзьдзяў. Так не бывае, каб сёньня людзі ваявалі, а заўтра пілі разам. А калі й п'юць, дык трымаюцца за пісталеты ці за кінжалы. Я запытаўся, ці не баіцца Алекс назаўжды застацца на вайне, ніколі болей не прывыкнуць да нармальнага жыцьця. Ці зьбіраецца ён вярнуцца ў Піцер? Ён, – адказвае, – які быў, такі й застаўся. Чачэнія яго не зьмяніла, ён у гэтым упэўнены. Як любіў ялавічную тушаніну, так і любіць. Прыехаць у Чачэнію – гэта як выйсьці на суботнік, прыбраць сьмецьце з двара. "Шэсьць дзён працуй, грошы зарабляй, і таму падобнае, а на сёмы дзень выйдзі і бясплатна зрабі нешта для ўсіх". Часам трэба працаваць, а часам, калі трэба, выйсьці й абараніць чыёсьці права нармальна жыць. Ён кажа пра шэсьць дзён і сёмы, але гэта не азначае, што ён верыць у Бога; вядома, – лічыць ён, – нешта там павінна быць, нейкая сіла, аўра. Ці гэтая сіла ўхваліла б тое, што яны зрабілі? Яна імі й кіравала, – не вагаецца ён.

А шостай увечары пасьля вайны ён пойдзе і забярэ свайго сына ад жонкі. Не баіцца, што супраціўнік можа схапіць іх у палон. Папярэдзіў мяне, каб я не рабіў на матэрыяле размовы просты журналісцкі артыкул. Я паабяцаў напісаць мастацкі тэкст.

Алекс сядзіць нага за нагу і нэрвова дрыгае ступнёю. У руках круціць запальнічку. Праз кожныя тры хвіліны пераключае каналы радыё. Прыймач лямантуе на ўсю моц. Алекс кажа, што чачэнцы ніколі не падзеляцца ні сваім горам, ні сваімі прынцыпамі. Наўрад ці Салам расказаў, як вар'яцееш, калі ажыцьцяўляюць "дывановую бамбардоўку" гораду, а ты сядзіш у акопе й ня можаш нічога зрабіць. Наўрад ці Шаміль раскажа, як яго акружылі і крычалі яму: "Урук, табе каюк!" Іх атрад выручыў Шаміля. З тых часоў яны ваююць разам. Пра такіх, як Шаміль, трэба пісаць, а не пра яго, Алекса.

Ён скрывіў вусны, не жадаючы распавядаць, як яны служылі ў дэсанце разам з Саламам, бо Салам на ягоным месцы не распавядаў бы. Салам – ягоны найлепшы сябра. Бабуля Салама так і не расказала яму, як Сталін высяліў іх у 44-м. Раней, калі прыяжджаў у Грозны, ён быў дурны: пра ўсё распытваў. Быў акурат пэрыяд пасьля галоснасьці, яму карцела напісаць артыкул. Салам неяк сказаў: "Калі расказаць, тады ты будзеш віну адчуваць, бо высялілі нас вы, расейцы, а ты – расеец. Калі не расказаць – гэта ня значыць забыць; гэта значыць памятаць, ня помсьцячы. Калі б я табе расказаў, я б цябе словам атруціў, бо ты стаў бы сваіх ненавідзець". Выказаць усё – як высеяць усю пшаніцу да астатняга зернетка, і пухнуць з галадухі.

Словы – надта моцная цэгла, а памяць – надта моцны цэмэнт, каб казаць усё і ўсё памятаць. Словы будуюць вежу мінуўшчыны. Памяць – замес будучыні.

"Мы зь дзяцінства запамінаем як аксіёму: Жылін з Кастыліным[5] добрыя, Кастылін, праўда, трошкі няўдалы, а горцы – кепскія, толькі Дзінка добрая. На самой справе Дзінка дурная як даўбешка: яна прынесла пілку, малака, ляпёшку; Жылін уцёк, нажэрся, напіўся. Што ён пасьля мог зрабіць? Бацьку Дзінкінага забіць, маці нагайкаю вытнуць, саклю спаліць і паехаць змагацца за правы прыгонных сялян ці яшчэ азбуку складаць". А цяпер ягоныя нашчадкі зноў прыехалі па прыгоды. Алекс ганарыцца тым, што разарваў кола нацыянальнага зману. Але мы ўяўляем жыцьцё ў XIX ст., гісторыю і яе пэрсанажаў так, як іх апісаў Талстой. А хто ведае, якія яны былі насамрэч.

Алекс ня вельмі любіць сваіх суайчыньнікаў. Салам – ягоны сябра, а ў Піцеры ў яго ніколі не было сяброў. Хіба там могуць сябраваць? Там кожны на сябе цягне. У Алекса нос зламаны, бо ў яго не было дружбакоў. "Эээ", – ён разяпіў рот. І трох зубоў бракуе. Вось жа неяк у юнацтве пайшоў на дыскатэку: ён быў адзін, супраць яго – пяцёра. Калі Салам патэлефанаваў і сказаў, што ў Чачэніі – дрэнь, каб ён прыяжджаў, ён не вагаўся ні хвіліны. Кожны чалавек павінен удзельнічаць у нейкім змаганьні за свабоду, супраць несправядлівасьці. Расея супраць Чачэніі – гэта як пяцёра проці аднаго на танцах. Фэдэралы палююць з паветра на людзей. Было такое, што Алекса хацелі забіць з шрубалёту, а ён хаваўся, ціснуўся за камянямі. Тра-та-та-та. Думае: не пеканула, значыць яшчэ жывы. Шарах у другі бок каменя. Шрубалёт разьварочваецца і тра-та-та-та...

Алекс лічыць, што расейцы выракліся ўсіх традыцыяў: толькі б гарэлку жлукціць і тэлебачаньне глядзець. Яшчэ й пруцца паўсюль, хочуць, каб усе зажылі таксама, як і яны.

Паступова размова згасае. "Чым менш скажаш, тым больш зробіш", – заўважае Алекс.

## 4. Руслан

З Русланам мы гаварылі нядоўга, і пісаць амаль няма чаго. Нешта расказваць ён рашуча адмовіўся, затое ён быў адзіны, хто ставіў пытаньні мне. Сказаў, што яны, чацьвёра, вялікія сябры, і будуць сябраваць і пасьля вайны. На пытаньне, дзе яны бяруць грошы на жыцьцё і адпачынак, адказаў нейкім чачэнскім выразам, блытана пераклаўшы яго на расейскую мову. Па-расейску ён размаўляе вельмі кепска, пры гэтым ужывае шмат вобразаў і параўнаньняў.

– Вы прасілі дазволу ўкраінскіх уладаў, каб прыехаць?

– Калі баран просіць у авечкі дазволу, гаспадар ніколі ягнятаў не дачакаецца.

Першае, што ён зробіць пасьля вайны – ажэніцца. Верыць, што яны, партызаны, пераможуць расейцаў, нягледзячы на самалёты, ракеты, спадарожнікавую разьведку, бо ў чачэнцаў таксама ёсьць сакрэтная зброя. Самой зброі ён ня бачыў, але думае, што яна лязэрна-гукавая...

У кіеўскім музэі Булгакава сярод іншых дакумэнтаў можна знайсьці зварот кіраўнікоў Украінскай Народнай Рэспублікі да жыхароў Чарнігаўшчыны з папярэджаньнем аб тым, што нельга пакідаць сховішчы, бо ваякі-ўкраінцы ўжываюць асаблівыя прамяні для асьляпленьня супраціўніка...

Ён ня ведае, колькі людзей забіў, можа ніводнага, можа – дзесяць. Не дабачыш, дзе куля ляціць і куды зьверне. Дзяўчаты, што чакалі палонных, якіх яны ўтрымвалі, могуць прыехаць да Руслана. "Чачэнец іх кахаць будзе, глядзець будзе. Чачэнец за свабоду ваюе. Чачэнец прыходзіць у хату і вітаецца: "Будзь вольны!" Нас расейцы выселілі; чачэнец расейцаў ніколі не высяляў. Горы нашыя, а не іхныя. Мы не хацелі з расейцамі гэтага рабіць. Чачэнец ваюе сумленна. Яны згвалцілі добрую дзяўчыну, з блакітнымі вачыма. Хіба чачэнец

гвалціць дзяўчат? Хіба Басаеў у Будзёнаўску, Радуеў у Кізьляры гвалцілі дзяўчат? Чачэнец хоча прыгожа ваяваць". Яны хацелі пратрымаць полонных да канца вайны, а пасьля судзіць у судзе...

## 5. Шаміль

Не сумняюся, што Шаміль – самы дзіўны з чачэнцаў, якіх я калі-небудзь сустрэну.

Паколькі на твар і выгляд ён мне выдаваў на Фабрыса дэль Донга, я запытаўся, а ці Фабрыс на ягоным месцы дзейнічаў бы так, як ён? Чачэнцы, – адказаў ён, – а сам ён і пагатоў, ня могуць быць падобныя да Фабрыса. Фабрыс – гэта імправізацыя, жарсьць, імпэт, захапленьне. Фабрыс марнеў за Клеліяй, Шаміль аддаў бы перавагу герцагіне дэ Сансэвэрына. Шаміль таксама паехаў бы ў Ватэрлё, але гэта было б не парываньне, а разважнае рашэньне.

– Мы сабраліся спантанна. У адным з баёў. Салам з Алексам і Хасанбэкам раней сябравалі. Руслан – нечы сусед. Ну і я . Як Грозны ўзялі – мы пайшлі ў горы. Пасьля вярнуліся ў Грозны. У Салама ёсьць дом, напаўразьбіты. У нас свая тактыка: ударым за горадам і вернемся. У горадзе пачуваесься як бы не зусім на вайне. Даведаліся, што два гады згвалцілі дзяўчыну. Вылічылі іх, прыцягнулі ноччу, з завязанымі вачыма. Можа, лепей было хлопнуць іх sur-le-champs[6].

Ваенная лёгіка.

– У горадзе закладнікаў не шукаюць. У наш раён расеец ня соваецца. Прыходзіў які – разьбіраўся Алекс. У палонных на нагах ланцугі, рулі да скроні прыставім. Судзіць іх зьбіраліся.

– Табе не шкада было кінуць інстытут, не атрымаўшы дыплёму?

– Шкада, не шкада... Што ж, аддаваць ім Чачэнію?

Для Шаміля паняцьці свабоды, незалежнасьці, павагі да бацькоў шмат значаць. У юнацтве ён ня быў "шчырым" чачэнцам. Ягоныя сваякі ня надта былі ім задаволеныя. У дзяцінстве ён ні разу ні з кім ня біўся. Ён быў гэткая... пяціногая авечка сярод сваіх аднагодкаў. Хіба сапраўдны чачэнец пойдзе вучыцца ў інстытут замежных моваў, сярод тамтэйшых фіфачак? Ваяваць –значыць, даказаць, што твае пераканаваньні вартыя. Шаміль лічыць, што ён здолеў даказаць. Можа, ён ваюе горш, чым ягоныя сябры, але ж ваюе. Mourir pour les idees de mort lente[7] для Шаміля – шык, паспытаць якога шанцуе ня кожнаму.

Шаміль больш за год ваяваў безь перадыху, а цяпер дазволіў сабе месяц адпачынку. Першы месяц ён перабавіў у Менску, завёў там сабе дзяўчыну ў Зялёным Лузе. Адбіў яе ў аднаго цікавага француза. Француз цяпер паехаў у Чачэнію. Больш за ўсё ў жыцьці Шаміль шкадуе, што не ўтрымаў француза ад гэтага кроку. Мае прадчуваньне, што таго заб'юць. У Менску найбольш палюбіў опэру (слухаў "Рыгалета") і касьцёл на Залатой Горцы (Дэбюсі і арганіста Шарава). Нязгодны з трактоўкай блазна Рыгалета як галоўнага вінаватага ў трагедыі. У касьцёле Сьвятога Роха яму памятныя цяжкі крыж пад стольлю ("навісае над людзьмі, як шуляк над куранятамі"), сьнегавая баба з крыжыкам з галінак у руцэ на цьвінтары і гліняныя скульптуры. Паводле ягоных словаў, дзяўчына добра кахала яго – лепей і мацней, чым ён яе – і частавала нейкім адмысловым трункам, які сама гатавала. Ён зьехаў раптоўна. Дзяўчына цяпер, напэўна, у роспачы. Але ён мусіў зьехаць зь Менску, бо на яго выйшаў афіцэр расейскае разьведкі. Каб завэрбаваць. Сказаць штосьці пра таго, хто паспрыяў, каб яго знайшлі, адмовіўся. Сястру і мяне ў Кіеве ні хвіліны не падазраваў: усё на твары бачна.

Паразмаўлялі крыху пра Францыю. Ягонае найбольшае ўражаньне ад Парыжа – вуліца Watt, што праходзіць пад чыгункамі і шашой, вуліца-фантасмагорыя без будынкаў і крамаў, ні на зямлі, ні пад зямлёй, вуліца, пра якую пісаў Віян... Найбольшае ўражаньне ад Францыі – замак Сальс на поўдні, у францускай Каталёніі, ля Пэрпіньяна. Шаміль наведаў яго а другой гадзіне ночы, калі ягоныя спадарожнікі спынілі машыну, каб падрамаць. Шэры, змрочны, на пустэльным, выпаленым узвышшы, замак здаўся яму дэкарацыяй да клясычнага закону трох адзінстваў і нагадаў замак "Макбэта" ў фільме Орсана Ўэлза. У сярэдзіну Шаміль ня трапіў: брама была замкнёная, муры занадта гладкія і стромкія. Спрабаваў сфатаграфаваць сябе на фоне замка, трымаючы фотаапарат на выцягнутай руцэ. Пасьля з расчараваньнем прачытаў у "Petit Robert des noms propres", што Сальс – ня замак катараў, а быў пабудаваны ажно прыканцы XV ст.

Шаміль мяркуе, што а шостай увечары пасьля вайны яны, чацьвёра, разыйдуцца назаўжды, каб адкрэсьліць мінулы час ад будучага. Яны сябры паводле прынцыпаў і доўгу; а таксама паводле сюжэту той містэрыі, у якой удзельнічаюць. Яны артысты, іх стыль – свабода і гонар, іх пэрформанс – вайна. Мэта спэктаклю – ачысьціць душы гледачоў і заваяваць права на свабодную творчасьць. Цяпер адзін бок ваюе за грошы, другі –за ідэю. Тыя, хто ваюе за грошы, на самой справе статысты. Пратаганісты – тыя, хто ваюе за ідэю. Толькі ад іх залежыць вынік вайны. Калі яны змогуць іграць да апошняга, да заслоны, яны перамогуць. Калі выдыхнуцца – яны прайграюць. Для Шаміля вайна – гэта ня толькі жанр і стыль, гэта яшчэ і, зь іншага боку, прылада, інструмэнт, сродак зьмяніць сябе; апроч таго, гэта грым, каб замаскаваць тое, што хочаш, але ня можаш зьмяніць. Вядома, паклікае на вайну сумленьне, патрыятызм, воля бацькоў. Але пасьля атрымліваецца, што вайна – гэта інсцэніроўка, якую ствараеш ты, і якая адначасова стварае цябе.

Для некага вайна – суцэльны сцэнар фільму жахаў. Шаміль прайшоў праз пэрыяд рамантызму, калі здаецца, што варта пратрымацца яшчэ крышку, адбіць яшчэ лапік зямлі, і ўсе схамянуцца, і рэжысэры апамятаюцца, зьнікне несправядлівасьць. "Мы – вашыя сябры, кідайма стрэльбы, будзем жыць кожны ў сваёй хаце", – пісаў Шаміль на мурах, на сьнезе, на газэтах, адступаючы. Дзіўна, як у вершы:

... sur les pupitres et les arbres,
sur la sable, sur la neige,
sur l'echo de mon enfance,
j'ecris ton nom[8].

Ён прайшоў праз пэрыяд імаралізму, калі іх запёрлі ў горы. Тады ён размаўляў толькі мацюкамі, яго аж юдзіла забіваць, а думкі абмяжоўваліся ежай і ложкам. Пэрыяд містыцызму быў адзначаны прыкметамі: колькі разоў кракнула варона – двойчы ці тройчы; як складзеная коўдра на ложку ва ўдалыя дні, а як – калі не шанцуе.

Найлепшы каханак – той, хто ўмее найдаўжэй расьцягнуць момант, калі вусны яшчэ не дакрануліся да яе смочка, але ўжо адчуваюць пушок вакол яго. На вайне перамагае той, хто ўмее замарудзіць разьвіцьцё жанру і ўласныя густы, запаволіць сваё сталеньне ад клясычных узораў "Іфігеніі" і "Сіда"[9] да руціны рэалізму, цяжкое будзённае працы ў акопах і засадах, пасьля да натуралізму, цынізму, які падобны на бадзяк у агародзе: адзіная якасьць характару, якой ужо ніколі не пазбавісься, калі яна ў цябе ёсьць. Небясьпечны сымптом – панаваньне дэкадансу, калі здаецца, што вайне ня будзе канца, бо ён – знак набліжэньня экзыстэнцыйнае пусткі, якою дыхае сьмерць. Прайграе той, хто сьпяшаецца згуляць наступны акт.

Штодзённае мастацтва, зьлепленае з чужых цытатаў, досьціпу, досьведу, з аксымаранічных структураў, адкрытых Якабсонам у паэме Пэсоа, з R-комплексаў і зьнікненьняў аптымізму, – мёртвае. Нобэля трэба даваць за творы мастацтва дзеяньня, якія ствараюцца тымі, хто змагаецца. Шаміль Басаеў быў бы варты Нобэля, калі б яму ўдалося захапіць горад у тыле ворага і праз гэта дабіцца міру, не праліўшы ані кроплі крыві, бо ягоны сцэнар – гэта важкі ўнёсак у скарбонку сусьветнае драматургіі.

Не, не пра вайну казаў Шаміль, прыхільнік актыўнага мастацтва, прынамсі, не пра тую вайну, антонім якой – мір.

Ён адмовіўся падрабязна распавядаць пра тое, як ваяваў, спаслаўшыся на Геракліта: "Шматведаньне розуму не навучае". Да расейскай мовы ставіцца нармальна, хоць быў недалюбваў яе. Што зробіш, расейцы прывучылі суседзяў думаць па-расейску. Ня важна, на якой мове чалавек думае, важна, як ён вітаецца зь людзьмі.

– А ты як вітаесься?

– Будзь вольны!

– Une flamme a nos yeux:
a l'eglise on j'allais
on l'appelait le bon Dieu.
L'amoureux l'appelle l'amour,
le mendiant – la charite.
Le soleil l'appelle le jour...
Et le tchetchene – la liberte?[10]

У гэтым няма нічога благога, – адказаў ён. Нічога, калі ведаць межы свабоды і помсты.

Тэкст скончаны. Для парадку трэба яшчэ замкнуць сюжэтнае кола.

Шаміль расказаў, што вечар быў сьцюдзёны і трывожны. Шаміль з Русланам хваляваліся, бо цэлы дзень чулі стрэлы, а хлопцаў усё не было. Павячэралі мярзотнай ялавічнай тушанінай, а палонныя – хлебам з моркваю. Выйшлі, каб абмеркаваць плян на наступны дзень. Тымчасам вярнуліся хлопцы. У той дзень забілі двух іхных знаёмых. Кепска. Калі яны вярнуліся ў камэру да палонных, тыя se masturbaient[11]. Шаміль, які палічыў за лепшае не вымаўляць гэтае слова па-расейску, у той вечар прапанаваў зрабіць палонным тое, што ім зрабілі. Іншы раз пачуцьці бываюць мацнейшыя за розум.

– Андрей, какого х... ты прие...? – паўтарыў мне Шаміль у адказ на маё пытаньне, ці ён у нечым каецца.

[1] Гэта наймаладзейшы ў нашай групе (фр.)

[2] Старажытную (укр.).

[3] Раман Стэндаля "Пармскі манастыр".

[4] Малады маркіз; так зьвярталіся да Фабрыса дэль Донга ў рамане "Пармскі манастыр".

[5] Героі апавяданьня Талстога "Каўкаскі палоньнік".

[6] Зараз жа (фр.); літаральна – на полі.

[7] радок зь песьні францускага барда Жоржа Брасанса: "Паміраць за ідэі павольнай сьмерцю". Сэнс у кантэксьце: тыя, хто агітуюць нас паміраць за ідэі, няхай паміраюць самі, але павольнай сьмерцю, тады мы паглядзім на іх.

[8] Урывак зь верша Элюара "Свабода":
... на партах і на дрэвах, на сьнезе і пяску, на рэху зь дзяцінства пішу тваё імя.

[9] Клясычныя трагедыі Расіна і Карнэля.

[10] Прыпеў зь песьні бэльгійскага і францускага сьпевака Жака Брэля.
Нейкі агеньчык у вачох: у царкве, куды я хадзіў, яго называлі Боженькам, закаханы называе яго каханьнем, жабрак –міласьцінай. Сонца называе яго днём... А чачэнец – свабодай?
У песьні апошні радок: "Et le brave homme – la bonte".

[11] Мастурбавалі(фр.)

■ ГАННА МАТУСЭВІЧ

# Койданаўскі дыярыюш



2.04. Учора з раніцы паляцела ў кантору, пасьля абеду паехала ў Менск. (Трэба было купіць "Новы запавет" ды паслаць адной няшчаснай жанчыне, роспачны ліст якой я бачыла ў "Звязьдзе".) А ў Менску — аблога. Ах каб на вас! Столькі паблукала па горадзе, пакуль дабралася да шапіка ТБМ! Насупраць жалезнага Фэлікса плойма міліцыянтаў заціснула жменьку маладзенькіх хлопчыкаў са сьцягамі. І ў мяне сьціснула сэрца... Так бы і ўпляжыла, здаецца, гэтым "дубінанасільнікам" сваімі ванзэлкамі! Але ж пасунулася далей. Шмат людзей! Сьцягі! Кардон міліцыянтаў. Не пускаюць на вакзал. Абазвала іх "ёлупнямі" ды мусіла абходзіць...

А з раніцы прыйшлі людзі ў кантору, хоць і няшмат. Хацелі дамагчыся ад Сімаковай — старшыні прафкаму — каб яна прызначыла афіцыйную дату прафсаюзнага сходу. Сімаковай не было. Людзей разагнаў другі член прафкаму — Несьцяровіч.

Але калі я прыехала зь Менску, знайшла ў хаце мужа да сябе не падобнага. Супраць яго ўсчалі рэпрэсіі. Майстар Манойленка напісаў на яго ды на іншых мужчынаў, што ратавалі Амбражэвіча* (дзякуй Богу, ужо ходзіць!) "докладную". Выставіў іх, як прагульшчыкаў. А яшчэ Лобач В.А., начальнік аддзелу кадраў, напісала на мужа "обьяснительную", дзе ўжо на 2.04 ён выглядае, як подбухторшчык. Але падбухторшчыцай была я! За вечар, раніцу ды часткова яшчэ прыхапіўшы працоўнага часу муж сяк-так агораў тлумачальную цыдулку супраць Манойленкі. А я сёньня з раніцы нанесла запытальны візыт Валянціне Андрэеўне, сваёй даўняй знаёмцы, між іншым добрай жанчыне, якую я паважаю. Некалі яна крывасьведчыла на судзе супраць Макаеда ды іншых мужчынаў**. Я ёй у вочы тады сказала: "Калі б не было вас, падбрэхічаў, дык і немцы не былі б фашыстамі, і Камушэнка ня быў бы Піначэтам (мянушка нашага начальніка)!" Яна наляцела на мяне, але рэпрэсіяў, шантажу ня ўсчала. Пасьля яна стала нам дапамагаць. І вось гэтая "объяснительная"?..

Я спытала ў яе наўпрост: "Калі вы тапілі Макаеда, Вы сказалі, што Вас прымусіў гэта зрабіць начальнік. Скажыце, хто цяпер Вас прымусіў напісаць данос на майго мужа? У яго слабое сэрца. Вы што, хочаце, каб ён пайшоў усьлед за Амбражэвічам? На нас, жанчынах, ляжыць такая адказнасьць за ўсё..." Яна стала спакойна расказваць, што мой муж учора раніцай падыходзіў да яе раіцца наконт прафсаюзнага сходу. Гэта чуў Несьцяровіч і даклаў Камушэнку, а той ужо "дастаў" ад яе гэтую "объяснительную"...

"Камушэнка што, гвалціў яе, нож да горла прыстаўляў?" — круціліся пытаньні ў маёй галаве. Але я іх не задавала, бо ўжо тады амаль (а цяпер канчаткова) упэўнілася, што ў трагічным выпадку з Амбражэвічам, а яшчэ раней у выгнаньні Макаеда —вінаватая я, і толькі я. Бо дурніца. Бог падказвае мне столькі варыянтаў дзеяньня, а я сплю! Вось і сёньня. "Бусьлік" (зачасьціў ён да нас!) пераказаў мне апошнія навіны зь лякарні. Амбражэвіч то ачуняў, але ж псыхічна нездаровы. "Усё адно, — кажа, — жыць ня буду!" Вось каб Камушэкна прыйшоў у лякарню ды перапрасіў яго...

Я схаджу да Сімаковай, буду прасіць яе, каб яна паўплывала на Камушэнку. Усё ж яна — Жанчына...

4.04. Я прышла да Галі Амбражэвіч, каб паслухаць, што яна скажа. Але мусіла больш гаварыць сама. Я яе ні ў чым не пераконвала, проста распавядала пра сябе. Тады й яна стала казаць пра сябе. Яна казала праўду, але ў той праўдзе не адчувалася душы. Ёй вельмі хацелася некалі мець дзіця, а цяпер — не... Я пайшла.

Нешта не давала мне спакою. Ужо прыцемкамі я прыйшла да яе зноў. Яна сказала, што ўсё ўжо вырашыла. Я пайшла. Насустрач мне беглі два сабакі. Адзін зь іх, чорны, паглядзеў на мяне нейкімі пранізьлівымі "прапашчымі" чалавечымі вачыма... Я адчула гідлівасьць і шкадаваньне...

5.04. Некалі ў ЛіМе (за 28.04.95, "Ім страшна ў цемры...") мне дадзена было сказаць: "... гэта надзвычай добра, калі існуе гармонія паміж парадзіхай і дзіцём, паміж тымі, хто нараджае, і тымі, хто стаіць ля вытокаў".

І вось цяпер, калі я спаліла "дах над галавой", бо "пазначыўся тэрмін маёй волі" ("Інтэрнацкая хроніка"), калі я ўсё расказала пракурору й занесла яму "мае" нумары "НН", калі я ўсіх удзельнікаў падзей папярэдзіла: "хто не са Мной, той супраць Мяне", — я прапаную вам закасаць рукавы ды добра памыць рукі. Будзеце прымаць роды.

7.04. Ня ведаю, колькі прайшло часу з таго трагічнага здарэньня. (Дарэчы, яно не адно. У той самы дзень на Койданаўшчыне, кажуць, усяго было тры спробы суіцыду. У Фаніпалі адзін настаўнік і ў нас — два. Але, дзякуй Богу, усіх адратавалі.) Можа тыдзень... А я пражыла гадоў 5 наперад... Столькі падзей! Столькі людзей у нас перабывала! Як тады з Макаедам! Час быў настолькі спрасаваны, што я забылася пра сон і ежу. А сёньня — гадавое Сьвята. Вялікдзень. Вялікае Сьвята душы... Як добра, што ў пятніцу Бог даў мне магчымасьць зрабіць тое, што я не пасьпела зрабіць ў чысты чацьвер! Прапала надоўга электрычнасьць. Хоч-ня хоч — размарозіла лядоўню, а за гэты час вымылася ў ваньне пры дзьвюх сьвечках, ачысьцілася пры жывым агні.

Сёньня была ў Петра-Паўлаўскім саборы на імшы па Ларысе Геніюш. Сустрэлася з жанчынай, што зьбіраецца ехаць у Флярыду да Яна Пятроўскага. Запрасіла да сябе нас з мужам і сваіх сябровак. Гэта не жанчыны — агонь! Ніколі і нізавошта не паверу, што Беларусь памірае. Ды не, каханенькія-родненькія, Беларусь нараджаецца! Проста, шчыра, урачыста, з потам, крывёю, брудам і са сьлязьмі радасьці! Гэтыя падзьвіжніцы нашую веру ўсюды нясуць: на кірмаш і ў лякарню, у тралейбус і на пляц! Спадарыня Альжбэта смуткуе: "Было ў мяне столькі гэтых "Мудзішчавых"! Знаёмым дала, у вёску паслала, у Латвію адправіла — усім параздавала. І цяпер у мяне самой ніводнага "Мудзішчава" не засталося!"

Усе апошнія дні сьвідруе мяне думка: дзе падзелася "Наша Ніва"? Добра яшчэ, калі адсутнасьць яе зьвязана зь Вялікаднем у Літве, а калі...

*Койданава*

* Віця Амбражэвіч, майстар ГСП-42, павесіўся першага красавіка.

** Гісторыя з Макаедам распавядаецца ў "Інтэрнацкай хроніцы" ("Наша Ніва", №7-8'1995).

# Літва

## УЦЕКАЧЫ

Чакаецца, што разам зь веснавым цяплом праз Літву зноў хлынуць уцекачы, якія імкнуцца трапіць на Захад. Днямі пасьля перапынку каля польскага кардону былі затрыманыя 109 іншаземцаў, якія рыхтаваліся да нелегальнага пераходу дзяржаўнай мяжы.

У Літве цяпер знаходзяцца блізу 600 затрыманых нелегальных мігрантаў з Азіі і Афрыкі. Паводле закону іх трэба адправіць у тую краіну, адкуль яны патрапілі на тэрыторыю Літвы. Як правіла, гэта — Расея альбо Беларусь. Але ні з той, ні з другой дзяржавай у Літвы няма адпаведных пагадненьняў. Раней неяк дамаўляліся — Літва змагла вярнуць каля 1,5 тысячы нелегалаў. Прыкладна кожны другі нелегальны мігрант, затрыманы ў краіне, ня мае пры сябе дакумэнтаў, а часта і грошай.

Некаторыя просяць у Літве палітычнага прытулку. Статус уцекача яны атрымаць ня могуць: неабходны закон прыняты, але ён уступіць у сілу толькі пасьля стварэньня матэрыяльнай базы, падрыхтоўкі спэцыялістаў.

Дырэктар дэпартамэнту міграцыі В.Мінкявічус кажа, што лёс нелегальных мігрантаў, затрыманых у Літве, дапамогуць вырашыць міжнародныя арганізацыі, для якіх гэтая праблема ня новая. Літва таксама разьлічвае атрымаць ад міжнародных арганізацыяў сродкі на ўтрыманьне ўцекачоў. Астатніх нелегалаў, магчыма, удасца адправіць назад на радзіму.

Перапраўка ўцекачоў на Захад — адна з прыбытковых сфэраў дзейнасьці арганізаваных злачынцаў. "Можна толькі зьдзіўляцца, як нелегалы за двое сутак з Масквы праз Літву дабіраюцца да Варшавы", — кажа В.Мінкявічус.

Пасьля далучэньня да Жэнэўскай канвэнцыі ААН аб статусе ўцекача, Літва павінна стварыць цэнтар разьмяшчэньня мігрантаў. Яго плянуецца адкрыць у Рукле (Ёнаўскі раён) на былой вайсковай базе. Ён будзе разьлічаны на 340 месцаў.

Матэрыяльную дапамогу на суму 3 мільёны кронаў дае Літве Данія, якую, як і скандынаўскія краіны, запаланілі грамадзяне з ахопленых вайною краінаў былой Югаславіі. Мільён кронаў будзе выдаткаваны на рамонтныя работы, два мільёны — на падрыхтоўку пэрсаналу работнікаў сацыяльнае сфэры. Падтрымліваюць і іншыя паўночныя дзяржавы.

Начальнік аддзелу міграцыі Міністэрства працы і сацыяльнай аховы В.Гражуліс кажа, што ў цэнтры прыёму ўцекачоў атрымаюць часовы прыстанак людзі, якім з палітычных матываў на радзіме пагражае небясьпека. Калі будзе даказана, што чалавек прыбыў у Літву праз бясьпечную краіну, туды ён і павінен быць вернуты.

У цэнтры ўцякач зможа жыць да васьмі месяцаў. За гэты час дзяржаўныя інстанцыі павінны разгледзець яго просьбу наконт статуса ўцекача. У выпадку задавальненьня просьбы самакіраваньні павінны будуць знайсьці для ўцекача працу і жыльлё.



## ГРУНВАЛЬД

У Коўне кажуць, што віцэ-мэр гораду задумала ўчыніць Грунвальдзкую бітву ў сутоцы Нёману й Вяльлі. Чуваць нават крытычныя рэплікі: маўляў, зноў растрацяць невялікія бюджэтныя сродкі. Як кажа віцэ-мэр Коўна В.Маргявічэне, ідэя інсцэнізацыі бою нарадзілася ў яе і сяброў клюбу Вітаўтасаў, якія прапагандуюць сваю задуму па ўсёй Літве.

"Мітынгі ўжо надакучылі, асабліва моладзі", — лічыць



В.Маргявічэне. А такое тэатралізаванае мерапрыемства прымусіць паглыбіцца ў гісторыю дзяржавы больш, чым стандартныя прамовы з трыбунаў".

Віцэ-мэр упэўнівае, што расход бюджэтных сродкаў будзе мінімальны. Строі для "крыжакаў" і "літоўскіх ваяроў" шыюць студэнты ковенскіх тэхнікумаў, гімназіяў, ВНУ. Тканіна — з тэкстыльных прадпрыемстваў і рэстаурацыйных майстэрняў гораду. Моладзь асабліва ахвотна ўзялася за выраб строяў і атрыбутыкі — шчытоў, мячоў, шаломаў. Нямала камплектаў строяў згадзілася бясплатна даць кінастудыя.

Сцэнар інсцэнізацыі даручана напісаць спэцыялістам ваеннага музэю, а ўдзельнічаць у "баі" згадзіўся першы полк літоўскага войска. "Усе сакрэты раскрываць ня стану, але ведаю, што дзея будзе цягнуцца хвілінаў 20", — кажа В.Маргявічэне.

## ГАЗЭТЫ

З прыходам вясны ў Вільні ўсё часьцей можна ўбачыць на вуліцах дзяцей, якія прадаюць газэты. Пераважна гэта — школьнікі, якія гандлююць у суботы.

Найбольшы прыбытак дае "Летувос рытас": 60 цэнтаў ($0,15) з кожнага прададзенага асобніка.

15-гадовы Аўгусьцінас кажа, што праца гэтая ня зь лёгкіх. Уставаць даводзіцца ў 5 раніцы, трэба заўсёды добра выглядаць, умець намовіць пакупніка. Аўгусьцінас прадае газэты ўжо два гады. За гэты час навучыўся многім хітрыкам, у яго нават сталыя кліенты ёсьць. Звычайна ён стаіць на праспэкце Гедыміна, дзе заўсёды знойдуцца пакупнікі.

У 11-гадовага Юлюса газэты часта застаюцца непрададзеныя. Але хлопчык асабліва не перажывае. "Рабіць усё адно няма чаго, чаму б не падзарабіць? Страты, калі яны бываюць, пакрываюцца бацькамі", — кажа Юлюс. Зь ягоных словаў, старэйшыя хлопцы не чапляюцца, грошы не адбіраюць, юныя прадаўцы газэтаў дапамагаюць адзін аднаму, часам мяняюцца газэтамі.

Некаторыя прапануюць прэсу проста на праезнай частцы: як толькі запаліцца чырвонае сьвятло, кідаюцца да кіроўцаў — і пакупнікі амаль заўсёды знаходзяцца. "Так хутчэй, —сьцьвярджае Мантас. — Акрамя таго, кіроўцы часта не бяруць рэшту".

Мантасу даводзілася адбівацца ад рэкету старэйшых. Аднойчы ў яго патрабавалі 2 літы — давялося даць. Але іншым разам ён паклікаў таварышаў, і тыя дапамаглі абараніцца. Выручку хлопчык аддае беспрацоўнай маці.

*Lietuvos Rytas*

## ШПІЯНАЖ

Паводле свайго геапалітычнага становішча Літва ўяўляе цікавасьць і для Захаду, і для Ўсходу, таму тут напэўна ёсьць разьведчыкі з абодвух бакоў, — сьцьвярджае дырэктар Дэпартамэнту дзяржбясьпекі Ю.Юргяліс.

Аднак ён жа крытыкуе імкненьне некаторых дзеячоў абвінавачваць у ўсіх бедах Літвы замежных шпіёнаў: "Ня трэба прыкрываць гэтым сваю безьдзейнасьць і памылкі. Калі дзяржава займае выразную рашучую пазыцыю, ніякія разьведкі не паўплываюць на хаду падзеяў".

Ю.Юргяліс сказаў журналістам, што і ў Літвы ёсьць сыстэма разьведкі за мяжой. Але ня трэба думаць, што гэта шпіянаж, пра які мы чытаем у кнігах: у сапраўднасьці гэта пераважна накапленьне і сыстэматызацыя "адкрытай" інфармацыі. Паводле Ю.Юргяліса, літоўская разьведка ёсьць толькі ў тых краінах, дзе Літва мае інтарэсы.

На пытаньне, як могуць паўплываць вынікі выбараў прэзыдэнта Расеі на становішча ў Літве, прадстаўнік дзяржбясьпекі сьцьвердзіў, што вялікая суседка ўжо з XVII ст. мела і заўсёды будзе мець інтарэсы ў Літве і што ўсё будзе залежаць толькі ад нашай цьвёрдасьці.

*BNS*

## ПОШЛІНЫ

Урад Літвы з 15 красавіка павялічвае мытныя пошліны на імпарт некаторых харчовых прадуктаў. Мыта за ўвоз малака і малочных прадуктаў павялічваецца з 20 да 30%, за імпарт масла і іншых жывёльных тлушчаў узрастае з 45 да 50%, але ня менш, чым 8 літаў за 1 кг. ($1 = 4Lt)

Мыта за імпартныя яйкі павялічана з 30 да 35%. На каўбасы і падобныя мясныя прадукты — з 14 да 15%, але ня менш, чым 8 літаў за 1 кг. Найбольш — з 35 да 70% — узрасла плата за імпарт цукру. Пошліна ня можа складаць менш, чым 1,2 літа за 1 кг.

З 15 красавіка ўводзяць таксама мінімальныя мытныя пошліны за імпарт мяса, птушкі і бульбы. За 1 кг імпартнага мяса давядзецца плаціць ня менш, чым 5 літаў, за 1 кг птушкі — ня менш, чым 4 літы, за 1 кг бульбы — ня менш, чым 0,4 літа. Мытныя тарыфы на гэтыя прадукты складаюць адпаведна 30, 25 і 25%.

*BNS*

## УЦЕКАЧЫ-2

Ужо 10 тыдняў у памежным навучальным цэнтры ў Вісагінасе (былы Сьнечкус, горад каля беларускай мяжы) знаходзяцца 46 уцекачоў: 8 кітайцаў, 15 курдаў, 3 афганцы, 20 пакістанцаў. У тым ліку 9 жанчын. Гэтая група была нелегальна ўвезена ў Літву зь Беларусі ў закрытым аўтафургоне 16 студзеня. 1 красавіка яны адмовіліся прымаць ежу і пагражалі масавым самагубствам, калі не атрымаюць статус уцекача і ня будуць вызваленыя.

Некалькі мужчын, сяктак размаўляючы па-ангельску, паскардзіліся, што іх трымаюць тут амаль 3 месяцы і невядома, колькі яшчэ давядзецца пакутаваць.

Хаміт Хан, які прадставіўся прафэсарам хіміі з Пакістану, сказаў:

— Я заплаціў 4 тыс. даляраў, каб трапіць у Нямеччыну — там для ўцекачоў добрыя ўмовы. Вярнуцца ў Пакістан я не магу з-за палітычнага перасьледу, бо адразу ж траплю ў турму.

Прафэсар сказаў, што людзі ўжо 50 гадзін нічога ня елі. Але калі хто-небудзь скажа, колькі іх тут яшчэ будуць трымаць, галадоўка будзе спынена.

Літве не ўдалося выслаць уцекачоў назад у Беларусь, бо тая адмаўляецца прымаць не сваіх грамадзянаў, хоць яны і рухаліся праз тэрыторыю гэтай дзяржавы.

*Respublika*



# Украіна

## НЕ СЬПЯШАЙСЯ Ў АБДЫМКІ, НЕ АТРЫМАЎШЫ ПРЫСТОЙНЫХ ПРАПАНОВАЎ

Факт уступленьня Ўкраіны ў Эўрапейскі Зьвяз асэнсоўвае ня толькі дарослая публіка, але й моладзь. Напрыклад, на сэмінары "Роля маладзёжных арганізацыяў у інтэграцыйных працэсах у Эўропе", які адбыўся ў Кіева-Магілянскай акадэміі. Высьветлілася, што ня ўсе, на каго заўтра ляжа абавязак фармаваць міжнародны імідж Украіны сьхільныя падладжвацца да Эўрапейскай супольнасьці.

**Паліталягічны клюб Інстытуту міжнародных зносінаў** мяркуе: галоўнае — не дапусьціць, каб пазытыўны працэс інтэграцыі перайшоў у нэгатыўны працэс падпарадкаваньня. І "празрыстыя" межы лічыць дачаснымі.

**Украінская студэнцкая ліга** ня можа адносіць Украіну да Эўропы датуль, пакуль у краіне не сфармаваліся і не навучыліся цывілізавана ўзаемадзейнічаць палітычныя сілы. Сымпаты самой лігі на баку правых. Ліга ўваходзіць у наймацнейшую на кантынэнце палітычную студэнцкую арганізацыю Эўрапейскага дэмакратычнага студэнцтва (EDS).

А вось **Саюз украінскай моладзі** ня згодны з моднай у Эўропе ідэяй роўнасьці людзей. Больш за тое, ён лічыць злачыннымі, антыгуманнымі і антынавуковымі размовы на гэтую тэму, бо жыцьцё стварыла адных рабамі, другіх — гаспадарамі. СУМ бачыць абразу украінскай нацыі ў тым, што Рада Эўропы "бярэ пад абарону" нацыянальныя меншасьці. Па-першае, кажуць лідары арганізацыі, ва Ўкраіне няма прадстаўнічых нацыянальных меншасьцяў, а ёсьць перасяленыя сюды прадстаўнікі некаторых народнасьцяў. Па-другое, барацьба нацыяў — справа натуральная і неабходная. А Рада Эўропы павінна толькі сачыць за тым, каб не даходзіла да крыві. Лідараў СУМу не задавальняе, што Эўрапейскі суд ставіць інтарэсы асобы вышэй за інтарэсы дзяржавы. Калі асобны чалавек замінае дзяржаве, то мае ён рацыю або ня мае, ён мусіць быць прыбраны — перакананыя сябры СУМу. Яны катэгарычна супраць адкрытых межаў: "Адкрыюць межы — перамяшаюцца нацыі, значыць, зьнікне адметнасьць кожнай. Да чаго прывёў вольны доступ у Эўропу? Туды рынуліся эмігранты з Азіі, Афрыкі і ствараюць там партыі, якія не адпавядаюць інтарэсам эўрапейскіх нацыяў. У той самай Радзе Эўропы не павінны ўдзельнічаць чорныя і жоўтыя расы — яны нічога для Эўропы не зрабілі".

**Ліга нацыянальнай моладзі** вітае прынцып эўрапейцаў: няхай баварац застаецца баварцам, а ўкраінец — украінцам. Нацыяналізм у лізе лічаць здаровым пачуцьцём і параўноўваюць яго з патрыятызмам. Лідары арганізацыі бачаць задачу ў выхаваньні новай нацыянальнай інтэлектуальнай эліты. Удзел у агульнаэўрапейскай інтэграцыі сябры ЛНМ лічаць выхадам з тупіковае культурнае сытуацыі, якая паўстала дзякуючы амэрыканскаму ўплыву: "Амэрыка стварыла масавую культуру. І стала паразытам на целе Эўропы, зь якой бярэ лепшае. Назад жа ў Эўропу яна пастаўляе свае эканамічныя і культурныя адкіды. Таму калі мы і прымем Захад, то не амэрыканскі".

**Хрысьціянская асацыяцыя моладзі і сям'і** пра амэрыканскі ўплыў думае па-іншаму. Сябры арганізацыі прапануюць адмовіцца ад падазронасьці ў дачыненьні да ЗША. "Амэрыцы нічога ад нас ня трэба, у яе ўсё ёсьць. А Ўкраіна гадуе ў ЗША сваю будучыню — маладых лідараў. Нашы хлопцы і дзяўчаты вучацца там, працуюць і атрымваюць інфармацыю, зь якой вяртаюцца на радзіму". Але ідэя інтэграцыі з Эўропай асацыяцыі таксама блізкая: "Хоць бы таму, што Эўропа ўся хрысьціянская".

**УНА-УНСО** заклікае цьвяроза ацэньваць пэрспэктывы зносінаў з заходнім сьветам — каб чарговы раз ня кінуцца ў абдымкі, ня ведаючы, ці нас любяць. Украіне ўжо знаёмыя розныя варыянты інтэграцыі з суседкай — Польшчай: ад Рэчы Паспалітай да Польшчы "ад мора да мора". Калі за інтэграцыю возьмецца Нямеччына, лічаць ва УНСО, яна хутка пераможа славянскае і англа-саксонскае атачэньне. Зь іншымі краінамі інтэграцыю ўвогуле немагчыма ўявіць. З Вугоршчынай, якая заўсёды цягнулася да Цэнтральнай Эўропы? З Румыніяй — зь яе тэрытарыяльнымі прэтэнзіямі да Ўкраіны? Тым больш з Турцыяй...

Урэшце на разьвітальным фуршэце прыхільнікі і супраціўнікі інтэграцыі мірна суседзілі за адным сталом.

*"Всеукраинские ведомости"*

№ 5/96
15—21
красавіка

# інфарматар
НАША НІВА

Новае слова на рынку беларускае прэсы - штотыдзень 12 палосаў патрэбнае інфармацыі

ШТОТЫДНЁВЫ ІНФАРМАЦЫЙНЫ ДАДАТАК ДА ГАЗЭТЫ НАША НІВА

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЕ BELARUSIAN PUBLIC RELATIONS ASSOCIATION

БІРЖА ПРАЦЫ • КНІГІ • РЫНАК • ТРАНСПАРТ • АДПАЧЫНАК • АДУКАЦЫЯ • СПАЖЫВЕЦ • ЗДАРОЎЕ • КІНО • ТБ • ТЭЛЕСАТ • РАДЫЁ • СПОРТ • МУЗЫКА • ЗА МЯЖОЮ



Нягледзячы на дынамічны рост у другой палове году, сярэдняе значэньне беспрацоўя летась было на ўзроўні папярэдняга году, што ёсьць вынікам ажыцьцяўленьня дзяржаўнай палітыкі, скіраванай на стрымваньне масавага вызваленьня працаўнікоў. Ва ўмовах працяглага эканамічнага крызысу такая палітыка вядзе да далейшага росту схаванага беспрацоўя, інфляцыі, падзеньня ўзроўню жыцьця насельніцтва. *Стар. 8*

## ГАСПАДАРКА

Служба 04. Са статыстыкі вынікае, што найчасьцей да няшчасных выпадкаў з газам спрычыняюцца асобы, якія самастойна перарабляюць газавае абсталяваньне, альбо рамантуюць калёнку ці пліту. Больш-менш вядома, каму ў доме можа стрэліць у галаву ідыёцкая ідэя. Магчыма, гэта дзіўна гучыць, аднак на суседа трэба данесьці, калі ён зрабіў сабе такія "газавыя ўдасканаленьні". Чытайце пра газ у нашым доме на стар. **5**

На кожнай рэчы, блюза гэта, паліто ці шапка, заўсёды на цэтліку ёсьць сымбалі. Яны азначаюць, як правільна мыць, прасаваць і сушыць. Мы разумеем, як цяжка памятаць, што дакладна азначае кожная пазнака.

На стар. **5** "Інфарматар" дае тлумачэньні некаторым сымбалям, спадзеючыся на тое, што гэта інфармацыя цяпер заўсёды будзе ў Вас пад рукой.



## СПАЖЫВЕЦ

Пасьля выхаду ў сьвет другога нумару "Нашае Нівы", дзе ў дадатку "Інфарматар" былі прэзэнтаваныя кошты на Камароўскім рынку да нас зьвярнуліся чытачы з просьбаю надрукаваць у газэце парады дзеля вызначэньня розных прадуктаў харчаваньня. Сёньня ў рубрыцы "Спажывец" мы пачнем з рэкамэндацыяў, як вызначыць якасьць мясных і рыбных прадуктаў і іх прыдатнасьць да ўжываньня. Тым, хто зрэдку наведвае рынак і краму, а таксама тым, хто хоча праверыць свой гастранамічны досьвед,

*прысьвячаецца стар.* **10**



## ТРАНСПАРТ

Увага аўтааматараў. У гэтым нумары "Інфарматара" — усё пра аўтазапраўныя станцыі. Кошты на бэнзын, дызпаліва, а таксама пра тое, што яшчэ можна пабачыць на АЗС і якімі паслугамі пакарыстацца. Таксама рубрыка "Транспарт" прэзэнтуе: поўны расклад пасажырскіх самалётаў, якія ляцяць з найбуйнейшых аэрапортаў Беларусі.

Глядзіце стар. **11**

*З размовы спэцыялістаў:*

1-ы: **Рэальнага рынку жыльля, які б дзейнічаў, няма. Ёсьць чорны рынак, у якім дыктуе правілы маклер.**

2-і: **Кошты аўкцыёнаў таксама абсалютна не адпавядаюць рэальным коштам.**

3-і: **Дарэчы, не адэкватны сапраўднай цане і балянсавы кошт кватэры.**

Галоўны спэцыяліст: Мужыкі, кошт вызначаецца суадносінамі рэальнага попыту на кватэру і іх прапановы. У будучыні ён (кошт) павінен абмяжоўвацца пэўнай доляй рэальнага даходу грамадзянаў, а ў вызначэньні яго ва ўмовах рынку будуць адыгрываць ролю якасьць жыльля і прэстыжнасьць раёну. Сёньня ж людзі павінныя плаціць сотні мільёнаў рублёў за 2-3-пакаёвую кватэру. Такі кошт правакуе значнае перавышэньне попыту над прапановай. Дастаткова зазначыць, што кошт, які забясьпечвае даступнасьць жыльля, у сусьветнай практыцы — 10-12 гадавых даходаў сям'і.

*Ад рэдакцыі:*

*На стар. **3** глядзіце і аналізуйце кватэрны рынак у Менску.*

MONTE CARLO MUSIK
**АСНОЎНЫЯ ПЕРАДАЧЫ МСМ У КРАСАВІКУ**

КЛЮБ РОК-ЛЕГЕНДА МСМ (працягласьць 60 хвілінаў)
Прэзэнтуе **Франсыс Зэгю:** нд. 22.30—23.30
Рок-легенды МСМ
Прэзэнтуе **Франсыс Зэгю:** пн.-пт. 13.45—14.15, пн.-чц. 22.30—23.30
з 01/04 распачынаецца цыкаль перадачаў пра пап-зорку — **Ігуанэ Попа,** больш вядомага нам як **Іґі**. Ня так даўна ён выпусьціў новы альбом "Naughty Little Doggie" (Маленькі брудны сабачка).
ГОСЬЦЬ МСМ (працягласьць 30 хвілінаў)
Прэзэнтуе **Крыстыян Давід**
ср. 14.15, пт. 23.00, сб. 20.30, нд. 12.00
BUZZ TV (працягласьць 30 хвілінаў): ср. 20.00, чц. 23.30, сб. 12.00 і 22.00
Прэзэнтуе **Жэрар Бар-Давід** і **Даніэль Мус'е**:
BLAH-BLAH GROOVE (працягласьць 30 хвілінаў): пн.-пт. 18.00
Прэзэнтуе **Krootchey**.
BLAH-BLAH METAL (працягласьць 30 хвілінаў): нд.-чц. 00.30
АГЛЯД МСМ (працягласьць 55 хвілінаў): пн.-пт. 12.35—13.30
АГЛЯД У ВОЛЬНЫЯ ДНІ (працягласьць 60 хвілінаў): сб. 15.30, нд. 19.30

## МЕСЯЦОВЫ ПАСЯЎНЫ КАЛЯНДАР НА 1996 ГОД

**Друкуецца з удакладненьнямі**

| КУЛЬТУРЫ | ХАРАКТАРЫСТЫКА ДЗЁН | СТУДЗЕНЬ | ЛЮТЫ | САКАВІК | КРАСАВІК | ТРАВЕНЬ | ЧЭРВЕНЬ | ЛІПЕНЬ | ЖНІВЕНЬ | ВЕРАСЕНЬ | КАСТРЫЧНІК | ЛІСТАПАД | СЬНЕЖАНЬ |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Баклажаны, кабачкі, патысоны, гарбуз** | найлепшыя | 5 | 1,2,28,29 | 27,28 | 2,3 | 2,28-31 | 24-28 | 24,25 | – | 25,26 | 22,23 | 19 | – |
| | добрыя | – | 20 | – | 23,24 | 20-22 | 17,18 | 21-23 | 18-21 | 14-17 | 14,15 | – | – |
| | іншыя спрыяльныя | 23,24 | – | 22,23 | 30 | 3 | – | – | – | – | – | – | – |
| **Бабовыя** | найлепшыя | 1,5,27,28 | 1,2,28,29 | 27,28 | 2,3 | 2,28-31 | 24-28 | 24,25 | – | 25,26 | 22,23 | 19,23,24 | 20,21 |
| | добрыя | – | 20,23-25 | 22,23 | 19 | 20-22 | 17,18 | 21-23 | 18-21 | 14-17 | 14,15 | – | – |
| | іншыя спрыяльныя | 23,24 | – | – | 30 | 3 | – | – | – | – | 26 | – | – |
| **Капуста белакачанная** | найлепшыя | 27 | 20,23-25 | 22,23 | 19,23,24 | 20-22 | 17-18 | 21-23 | 18-21 | 14-17 | 14-15 | – | – |
| | добрыя | 28 | 1,2,28,29 | 27,28 | 2,3 | 2,28-31 | 24-28 | 24,25 | – | 25,26 | 22,23 | 19,23,24 | 20,21 |
| | іншыя спрыяльныя | 5 | – | – | 30 | 3 | – | – | – | – | 26 | – | – |
| **Капуста чырвонакачанная** | найлепшыя | – | 23-25 | – | 23,24 | 20-22 | 17,18 | – | – | 19 | 16,17 | 12,13 | – |
| | добрыя | 5 | 1,2 | 27,28 | – | – | 1,29 | 26,27 | 22,23 | 20 | – | – | – |
| | іншыя спрыяльныя | 23,24 | 28,29 | – | 19 | – | 3,31 | 26-28,30 | 24,25 | – | – | 14,15 | – |
| **Капуста квацістая, брокалі** | найлепшыя | 20,21 | 17 | 14,15 | – | – | | | | | | | |
| | добрыя | 27 | 23-25 | – | 19 | 3,31 | 17,18 | 24,25 | – | – | – | – | – |
| | іншыя спрыяльныя | 23,24,28 | 28,29 | 22,23,27,28 | 23,24 | 20-22 | 26-28 | – | – | 25,26 | – | – | 20,21 |
| **Бульба** | найлепшыя | 6,12,13 | 8-12 7-12 | 4-10 | 4-8 | 2-4 | 1 | 5 | – | 25,26 | 22,23 | 19 | – |
| | іншыя спрыяльныя | 5 | 28,29 | 21 | – | 3 | – | – | – | – | 24,25 | – | 19 |
| **Таматы** | найлепшыя | 6 | 1,2,28,29 | 27,28 | – | 31 | 26,27 | 24,25 | – | 25,26 | 22,23 | 19 | – |
| | добрыя | – | 20 | – | 23,24 | 20-22 | 17,18 | – | 20,21 | 16,17 | 24,25 | 21,22 | 19 |
| | іншыя спрыяльныя | 25,26 | 21,22 | 21 | – | 3 | 28 | – | – | – | – | – | – |
| **Рэдзькаўка** | найлепшыя | 12,13 | 8-12 | 7-10 | 4-8 | 7,8 | 3,4,7,8 | 1,5,6 | 1,2,5,29 | 2,3,29,30 | 27 | – | – |
| | добрыя | 14-16 | 15,16 | 11-14 | 9,10 | 4-6,11,12 | 2 | 9,10 | 6 | – | 5,11 | 1,8,9,27-29 | 5-8,25,26 |
| | іншыя спрыяльныя | 17,18 | 13,14 | – | – | – | – | 14 | 10,11 | 6,7 | 4,31 | – | 9 |
| **Рэдзька, рэпа, бручка** | найлепшыя | 12,13 | 8-12 | 7-10 | 4-8 | 7,8 | 3,4,7,8 | 1,5,6 | 1,2,5,29 | 2,3,29,30 | 4,27,31 | 1,27-29 | 25,26 |
| | добрыя | 1 | 4-16 | 15,16 | 11-14 | 9,10 | 4-6,11,12 | 2 | 9,10,14 | 6,10,11 6,7 | 5,11 | 8,9 | 5-8 |
| | іншыя спрыяльныя | 17,18 | 13,14 | – | – | – | – | – | – | – | – | – | 9 |
| **Салата** | найлепшыя | 23,24 | 20,23-25 | 22,23 | 19,23,24 | 20-22 | 17,18 | 21-23 | 18-21 | 14-17 | 14,15 | – | – |
| | добрыя | 25,26 | 1,2,21,22 | 21,27,28 | 2,3 | 2,28-31 | 24-28 | 24,25 | – | 25,26 | 22,23 | 19,23,24 | 20,21 |
| | іншыя спрыяльныя | 5 | 28,29 | – | 30 | 3 | – | – | – | – | 24-26 | 21,22 | 19 |
| **Буракі** | найлепшыя | 12-15 | 8,12-15,16 | 7-10,13,14 | 4-6,10,14,15 | 4,7,8,11,12 | 3,4,7,8 | 1,5,6,9,10,14 | 1,2,5,10,11,29 | 2,3,6,7,29,30 | 4,5,11,27,31 | 1,8,9,27-29 | 5-8,25,26 |
| | добрыя | 16 | – | – | 9 | 5,6 | 12,13 | – | – | – | – | – | – |
| | іншыя спрыяльныя | 17,18 | 13,14 | 11,12 | 7,8 | 16 | 2 | – | – | – | – | – | 9 |
| **Кроп** | найлепшыя | 23-24 | 20 | – | 23,24 | 20-22 | 17,18 | 21-23 | 18-21 | 14-17 | 14-15 | – | – |
| | добрыя | 5 | 1,2,23-25 | 22,23,27,28 | 19 | 2,28-31 | 24-28 | 24,25 | 25 | 21,22,25,26 | 18,19,22,23 | 19 | – |
| | іншыя спрыяльныя | 1,27,28 | 28,29 | – | – | 3 | – | – | 24 | – | 26 | 23,24 | 20,21 |
| **Хрэн** | найлепшыя | – | – | – | 14,15 | 11,12 | 7,8 | – | – | – | – | – | – |
| | добрыя | 14-16 | 15,16 | 13,14 | – | – | – | 5,6 | 6 | 2,3 | 27 | 8,9 | 7,8 |
| | іншыя спрыяльныя | 12,13 | 11,12 | – | 4,10 | 4,7,8 | 3,4 | – | 5 | – | 11 | – | 5,6 |
| **Часнык** | найлепшыя | 14-18 | 11-14 | 9-12 | 5-8 | 4,6 | 2 | – | 5,6 | – | – | – | 7,9 |
| | добрыя | – | 15,16 | 13,14 | 9-10 | 7,8 | 3,4,12,13 | 1,9,10 | – | 2,3 | 27 | – | – |
| | іншыя спрыяльныя | 6 | – | – | – | 16 | – | – | – | – | – | – | – |
| **Шпінат** | найлепшыя | 23,24 | 20 | – | 23,24 | 20-22 | 17,18 | – | 20,21 | 16,17 | 14,15 | – | – |
| | добрыя | 5,25,26 | 1,2,21,22 | 21,27,28 | – | 2,28-31 | 26,27 | 24,25 | – | 25,26 | 22,23 | 19 | – |
| | іншыя спрыяльныя | 27,28 | 28,29 | – | – | – | – | – | – | – | 24,25 | 21,22 | 19 |
| Дні, неспрыяльныя для пасадкі | усялякае культуры | 19-22 | 17-19 | 15-20 | 12,13,17,18 | 9,10,17-19 | 5,6,15,16 | 2,4,15,16,30,31 | 13-15,26-28 | 12,13,23,24 | 12,13,20,21 | 10,11,16-18 | 9-14 |
| Дні, у якія пасадка гародніны | непажаданая | 7-9 | 3-5 | 2,3,29-31 | 25-27 | 23,24 | 19-21 | 17,18 | 12 | 9-11 | 6-8 | 2-4,30,31 | 1,27-29 |

# ЖЫЦЬЦЁ З ГАЗАМ

Вы прачыталі ў газэце пра чарговы выбух газу. Гэта ўжо ж каторы за гэты год? – задумваецеся Вы. І пачынаеце баяцца, бо і Вы не застрахаваныя ад небясьпекі. Вашай газавай пліце ўжо дзесяць гадоў, а калёнцы ў ванным пакоі яшчэ болей...

Аднак страх неўзабаве мінае, бо людзям, на жаль, характэрная часам дзіўная легкадумнасьць. Хто ведае, ці не зьвязана гэта якім-небудзь чынам з нашым гістарычным досьведам да папярэднім ладам, калі ўсё было нічыйнае і функцыянавала абы-як, а мы мелі вельмі абмежаваны ўплыў на рэчаіснасьць.

А калі б пазбавіцца ад гэтых праяваў славяна-постсамуністычнае легкадумнасьці? З газам жыць можна. Мусіш аднак ведаць, як ім карыстацца. І самае галоўнае – не ігнараваць найменшыя падставы для падазраньняў.

Як засьведчылі мінулагодняя апытаньні, нашыя веды пра газ надзвычай нізкія. Напрыклад, шмат хто лічыць, што газам можна атруціцца. Гэта ня так. Вядома, прыродным газам можна ўдушыцца, аднак толькі ў тым выпадку, калі ў паветры ня стане адпаведнай колькасьці тлену.

Падчас аднае зь нядаўніх прэсканфэрэнцыяў прадстаўнік газавай аварыйнае службы прасіў журналістаў: зьвярніцеся да патэнцыйных самагубцаў, каб тыя не спрабавалі атруціцца газам, няхай скарыстаюць іншы спосаб. Ён распавёў пра страшэнны выбух, да якога спрычыніўся жыхар-самагубца. Адкрыўшы ўсе кранікі ў газавай пліце, бядак ніяк ня мог дачакацца ўласнае сьмерці. Нэрвуючыся, самазабойца запаліў цыгарэту, і ў выніку ад выбуху загінуў сусед.

**Што і калі выбухае?**

Няма, відаць, чалавека, які б ня ведаў, што сумесь газу з паветрам выбухае. Аднак мы звычайна не ўяўляем сабе, як няшмат патрэбна, каб да гэтага дайшло.

Прыродны газ выбухае ўжо пры 5-працэнтовай наяўнасьці ў паветры. Гэта сапраўды няшмат. Уявім тыповую кухню плошчай у 10 м² і аб'ёмам 25 м³. Адна фаерка газавае пліты выпускае на працягу гадзіны чвэрць кубамэтру прыроднага газу. Калі вокны ды дзьверы зачыненыя, а вэнтыляцыя працуе блага, выбуханебясьпечная сумесь утвараецца праз пяць-шэсьць гадзінаў. Дастаткова толькі, выходзячы з дому на працу, забыцца пра малако на пліце, што абавязкова зальле полымя...

**Данясі на суседа**

Мой разважны сябар, прачытаўшы гэты артыкул, пачаў хваляваца: "Парады добрыя, сам я магу быць супэрасьцярожным, але хопіць аднаго суседа-ідыёта і цэлы дом узьляціць у паветра". На жаль, мой сябар мае рацыю. Са статыстыкі вынікае, што найчасьцей да няшчасных выпадкаў з газам спрычыняюцца асобы, якія самастойна перарабляюць газавае абсталяваньне альбо рамантуюць калёнку ці пліту. А ўжо найвышэйшым глупствам бывае падключэньне газавае пліты з дапамогай гумавага шлангу. Не мінае і дня, каб газаўнікі ня выявілі гэткага "спэцыяліста".

Таму патрэбны суседзкі кантроль, які, безумоўна, больш якасны, чым кантроль адміністрацыйны. Больш-менш вядома, каму ў доме можа стрэліць у галаву ідыёцкая ідэя. Магчыма, гэта дзіўна гучыць, аднак на суседа трэба данесьці, калі ён зрабіў сабе такія "газавыя ўдасканаленьні".

Гэтаксама можна зьменшыць рызыку выбуху, калі купіць так званыя выбухапапераджальныя прыборы, альбо дэтэктары газу. Дэтэктар Вас засьцеражэ. У крамах і на рынку можна знайсьці дэтэктары італьянскія, амэрыканскія, тайваньскія. Ня трэба кіравацца толькі коштам вырабу. Самае галоўнае, каб дэтэктар меў сэртыфікат якасьці. Гэта значыць, каб апарат рэагаваў на прыродны газ альбо прапан-бутан, а не, напрыклад, на дэзадарант. Важны таксама тэрмін якаснай працы, што гарантуе вытворца, бо дэтэктары не рамантуюцца.

Дэтэктары газу – гэта невялікія электрычныя прыборы, якія сыгналізуюць пра зьяўленьне газу ў паветры задоўга да таго, як ягоная колькасьць дасягне выбуханебясьпечнага ўзроўню. Тады загараецца чырвоная лямпачка і выгукае пранізьлівы сыгнал. Больш складаныя дэтэктары абмяжоўваюць распаўсюджваньне газу і ўключаюць вэнтыляцыю. Такія апараты асабліва прыйшліся б даспадобы старым і хворым людзям, якім можа стаць блага, альбо якія могуць забыцца пра газ. Найпрасьцейшыя дэтэктары каштуюць блізу 40 даляраў, больш складаныя – да 80-ці.

У кватэрах, дзе вада награецца з дапамогаю газавае калёнкі, варта таксама ўсталяваць дэтэктар тленіку (аксіду) вугалю (прасьцейшыя каштуюць блізу 50 даляраў). Ён рэагуе на чад ужо пры яго 0,01-працэнтовай наяўнасьці ў паветры.

Інструкцыі дакладна распавядаюць пра тое, як усталяваць і карыстацца дэтэктарамі. Аднак асноўныя правілы гэткія:

– калі спажываем прыродны газ (лягчэйшы за паветра), дэтэктар вешаем высока – 30 см ад столі;

– прапан-бутан цяжэйшы за паветра, і таму дэтэктар павінен быць нізка – 30 см над падлогаю;

– чад важыць больш-менш гэтак, як паветра, але вытворцы рэкамэндуюць мацаваць дэтэктар на вышыні 1,80 м.

**Як праверыць шчыльнасьць**

У сваёй кватэры Вы можаце самі спраўджваць час ад часу шчыльнасьць злучэньняў і кранікаў з дапамогай рашчыны мыла, вадкасьці для мыцьця посуду альбо шампуню. Калі зьявяцца бурбалкі, гэта будзе значыць, што Вы знайшлі дзюрку. Увага! Ніколі не ўжывайце мэтад "пазнаваньня ў дзеяньні". Аднойчы мая знаёміца мела прыгоду, пра якую не забудзе да канца жыцьця. Яна пайшла ўначы ў ванны пакой і пачула ціхі гук, нібыта выходзіў газ. Яна запаліла сярнічку і прайшлася полымем уздоўж трубы. Успыхнуў сапраўдны гейзэр агню. На шчасьце, дзюрка была малая, да выбуху рэч не дайшла і полымя пашчасьціла зьбіць ручніком. Але калі б вэнтыляцыя працавала горш?

**Не ашчаджай на спэцыялісьце**

Сапраўдныя спэцыялісты-газаўнікі ня танныя, але ніколі не бярыцеся за працу самі. Калі штосьці выклікае падазраньне, адразу ж выклікайце майстра. Хоць раз на год спэцыяліст павінен праверыць тэхнічны стан калёнкі ці пліты. Сьцеражыцеся, аднак, даверу аб'явам накшталт "майстар – залатыя рукі...". У гэтага чалавека могуць быць у дадатак "курыныя мазгі". Найлепей запрашаць супрацоўнікаў сур'ёзных фірмаў, якія ў стане дакумэнтальна пацьвердзіць сваю кваліфікацыю.

Выклікаўшы майстра, уважліва паназірайце за ягонаю працай. Сачыце за рукамі. Калі для ўшчыльненьня ён выкарыстоўвае... крэм альбо нітрафарбу, нагадайце яму, што гэта недапушчальна. Увільготненае такім чынам пакульле хутка высыхае, што цягне за сабою ўтварэньне шчылінаў. Напрыклад, нітрафарба памяншаецца ў аб'ёме пасьля высыханьня амаль у дзесяць разоў. Для ўшчыльненьня выкарыстоўваюцца адмысловыя рэчывы, якія можна набыць у крамах. Так, смала Gebetanche Gas зусім не патрабуе пакульля. Праз пэўны час яна цьвярдзее, а каб дэмантаваць спалучэньне, дастаткова яго разагрэць, і рэчыва зноў стане мяккім.

**Новае абсталяваньне – болей бясьпекі**

Падумайце, ці не надышоў час купіць новую газавую пліту альбо калёнку. Звычайна айчынныя пліты можна купіць недзе за 250 даляраў. Але, магчыма, у краме Вам захочацца купіць лепшыя мадэлі. Таму будзьце гатовыя выдаткаваць 300-350 даляраў. Падобная сытуацыя і з газавымі калёнкамі. Таньнейшыя, айчынныя, каштуюць каля 150 даляраў, кошт на замежныя можа дасягаць 350 даляраў.

Новае абсталяваньне дазволіць Вам ашчаджаць газ, якога старыя калёнкі спажываюць болей. Акрамя эканомнасьці, новае абсталяваньне мае разнастайныя "бар'еры бясьпекі". Напрыклад, як у духоўцы, так і ў фаерках прадугледжана аўтаматычнае спыненьне прытоку газу пры аварыі альбо тады, калі хтосьці забудзе выключыць газ, а полымя пагасьне. Часам можна пачуць, што "ўвесь цывілізаваны сьвет адыходзіць ад газу і пераходзіць на электрычнасьць". Гэта ня так. Вядома, уладальнікам кватэраў з малымі й "сьлябымі" кухнямі варта набыць электрычныя пліты. Але цяпер дазволіць сабе перайсьці на электрапліту можа далёка на кожны. Таму дбайце пра тое, каб у памяшканьні спраўна дзейнічала вэнтыляцыя.

**Вэнтыляцыя – гэта гарантыя**

Абсалютна недапушчальна ня дбаць пра вэнтыляцыю. Добрая вэнтыляцыя засьцеражэ Вас ад выбуху газу, а таксама ад атручваньня газам яшчэ страшнейшым – чадам ці аксідам вугалю. Ён утвараецца, калі газ спальваецца ў паветры з малым утрымальнем тлену (кіслароду).

Пра чад гавораць і пішаць няшмат, хоць ён пагражае чалавеку болей, чым прыродны газ. Так, у 1995 годзе ад атручваньня чадам памерла ў Польшчы болей за 300 чалавек. Некаторыя людзі ўшчыльняюць вокны, каб заашчадзіць цяпло. Гэта натуральна. Аднак недаравальнай памылкай ёсьць заклейваньне кратак вэнтыляцыйных шахтаў. Адна такая кратка здольная за суткі сто разоў памяняць паветра ў пакоі. Лепш не выкарыстоўвайце электрычныя вэнтылятары, каб не рабіць блага суседзям, што жывуць на ніжэйшых паверхах. Ваш вэнтылятар можа выклікаць такія забурэньні ў вэнтыляцыйнай шахце, што ўнізе вэнтыляцыя практычна перастане функцыянаваць. Пах газу мы адчуваем, бо да яго дадаюцца спэцыяльныя пахкія рэчывы. Чад ня мае паху, таму атакуе чалавека без папярэджаньня. Праз лёгкія ён трапляе ў крывяцёк, дзе трывала спалучаецца з гемаглябінам. У выніку атрымоўваецца тлёнавае галаданьне мозгу ды ўсяго арганізму, што ўрэшце цягне за сабою зьнепрытомненьне й хуткую сьмерць. Навукоўцы ў якасьці экспэрымэнту запалілі ўсе фаеркі ў газавай пліце і мералі колькасьць тлёну ў паветры кухні сярэдняга памеру. Ужо праз гадзіну тлёну было так мала, што вучоныя спынілі досьледы, баючыся за сваё здароўе. Ці спынілася б гаспадыня, што готуе абед?

Яшчэ небясьпечнейшыя газовыя калёнкі, бо, хутчэй спажываючы тлён, яны болей "прадукуюць" чаду.

Гэта здарылася некалькі гадоў таму. Быў позьні вечар. Пасьля сьвяткаваньня імянінаў гаспадыня вырашыла памыць посуд. Ейны муж і дачка леглі спаць. Мыцьцё посуду зацягнулася, і кабеце зрабілася блага. Ні яна, ні ейная сям'я ніколі ўжо не прачнуліся. Калі б у кватэры была вэнтыляцыя, да трагедыі не дайшло б.

**Бомба ў балёне з газам**

Газ з балёну (прапан-бутан) больш небясьпечны за прыродны газ, бо выбухае ўжо пры 1,5-працэнтовай канцэнтрацыі ў паветры. Газовы балён як бомба. Вы, пэўна, памятаеце зь фізікі, што газ пад уплывам цеплыні павялічваецца ў аб'ёме. Расьце гэтаксама ціск, і калі газу ў балёне зашмат, ён можа выбухнуць. Газаўнікі ніколі не наліваюць яго даверху. Патрэбна, каб была так званая "газавая падушка". Заўсёды купляйце газ у прафэсійных дастаўнікоў – на газазапраўках ёсьць спэцыяльныя вагі, на якіх кантралюецца вага поўных балёнаў (норма пазначана на балёне). Часам дзеці кладуць у вогнішча балёнчыкі з-пад дэзадаранту і цешацца, калі яны выбухаюць. З газавым балёнам можа стацца гэтаксама. Ясная рэч, што Вы ня будзеце яго ставіць каля вагню. Аднак часам бывае дастаткова паставіць балён блізка да печы альбо на сонцы. Гэта цалкам забаронена! Дасьведчаныя людзі раяць таксама ня ставіць балёны ў памяшканьнях з падлогай, ніжэйшаю за ўзровень зямлі. І яшчэ: не захоўвайце ў памяшканьні запасныя балёны. Лепей увогуле іх ня мець. Калі ўсё ж маеце, то вынесіце іх на гаўбец, у гараж, і захоўвайце ў спэцыяльнай шафцы з добраю вэнтыляцыяй.

**Заўсёды захоўвайце спакой**

Вы заходзіце ў кватэру і адчуваеце пах газу. Не запальвайце ні ў якім разе сьвятло. Найменшая электрычная іскра можа выклікаць выбух. Выключыце лічыльнік. Адчыніце вокны і закруціце галоўны кранік на газавай трубе. Пры гэтым выклікаць газавую службу ня мае сэнсу. Газаўнікі існуюць для таго, каб сьцьвярджаць наяўнасьць аварыі і перакрыць доступ газу, а Вы гэта ўжо зрабілі. Потым пашукайце прычыну. Калі газ выйшаў праз Вашу нядбайнасьць (не закруцілі кранік) – справе канец. Калі выявілася якая-небудзь няспраўнасьць у абсталяваньні – паведамце адміністрацыі, і яна выкліча майстра. Калі ж нешта здарылася з газаваю плітой альбо калёнкай, то Вы мусіце выклікаць майстра за свой кошт. Але заўсёды, нават у прысутнасьці майстра, майце свой розум. Ня так даўна быў выпадак, калі газаўнікі казалі ўстрывожаным жыхарам, што сьмярдзяць сапсаваныя кансэрвы ў склепе. Праз колькі гадзінаў дом выбухнуў. Толькі цудам ніхто з жыхароў не загінуў.

**10 правілаў абыходжаньня з газам**

**1.** Перш чым запаліць газ, спраўдзьце, што кранікі закручаныя. Калі не – зачыніце, праветрыце памяшканьне і толькі потым запальвайце газ. Спачатку запальвайце сярнічку, а потым уключайце газ, асабліва калі ўключаеце духоўку.

**2.** Гатуючы ежу, пазірайце час-часам на запаленыя фаеркі. Перш чым класьціся спаць, праверце, ці выключылі газ. Гэтаксама зайдзіце на кухню, выходзячы з дому.

**3.** Спраўдзьце, што здолееце хутка знайсьці і закруціць кранікі на газавых трубах. Вы мусіце навучыцца адпаведна дзейнічаць у выпадку аварыі.

**4.** Калі Вас ня будзе доўгі час дома, абавязкова закруціце галоўны кран.

**5.** Не заклейвайце вэнтыляцыйных кратак. Спраўджвайце рэгулярна, што вэнтылятар працуе.

**6.** Купіце найбясьпечную пліту і калёнку. Купіце дэтэктар, асабліва калі газам карыстаюцца хворыя ці няўважныя людзі.

**7.** Прынамсі раз на год выклікайце на дом майстра, каб ён правяраў абсталяваньне ў Вашай кватэры. Патрабуйце ад адміністрацыі кантролю ва ўсім будынку.

**8.** Калі пачуеце пах газу на лесьвічнай пляцоўцы альбо ў склепе, адразу ж тэлефануйце ў службу 01.

**9.** Калі пачуеце пах газу ў кватэры, не запальвайце сярнічкі альбо сьвятла, адразу адчыніце вакно і выключыце газ.

**10.** Балёны з газам купляйце і напаўняйце выключна ў спэцыялістаў. Сачыце, каб балён ня быў перапоўнены газам.

*Падрыхтаваў П.Рагойша*

## СЫМБАЛІ, ЯКІЯ АЗНАЧАЮЦЬ, ЯК ПРАВІЛЬНА МЫЦЬ, ПРАСАВАЦЬ І СУШЫЦЬ.



**БЕЛАРУСКІ ФОНД СОРАСА**
**абвяшчае конкурс**
**на замяшчэньне пасады каардынатара праграмы**
**«Інфармацыйны цэнтар мастацтваў і культуры»**
Для ўдзелу ў конкурсе неабходна падаць матывацыйны ліст (*у адвольнай форме*) і рэзюмэ на ангельскай мове ***(біяграфічныя зьвесткі, адрас, кантактныя тэлефоны, атрыманая адукацыя, працоўная кар'ера, хобі).***
Абавязковыя прафэсійныя патрабаваньні:
- ***вышэйшая адукацыя,***
- ***навыкі валоданьня кампутарам,***
- ***добрае веданьне ангельскай, беларускай і расейскай моваў,***
- ***камунікабэльнасьць.***

Напісаныя ад рукі дакумэнты не разглядаюцца.
***Дакумэнты на ўдзел у конкурсе падаюцца на адрас:***
220027 г. Менск, пр. Ф.Скарыны, 65, корп. 11А БДПА, пак. 420, Беларускі Фонд Сораса.
**Апошні тэрмін падачы заявак — 29 красавіка 1996 году.**
**Кантактныя тэлефоны:**
**(0172) 32-80-92, 32-70-64, 39-93-46, 39-91-21, 32-77-13**

# Сьвет

**РЭЛІКВІЯ.** У саборы г. Трыру на захадзе Нямеччыны трэці раз у гэтым стагодзьдзі выстаўленая хламіда Хрыста. Перад сьмяротным пакараньнем легіянэры зьнялі яе з Ісуса, а не падзерлі, як іншыя часткі адзеньня.

У трырскім саборы рэліквія захоўваецца ўжо 800 гадоў. Яна будзе даступная для сузіраньня да сярэдзіны траўня. Чакаецца, што хламіда прыцягне найменей адзін мільён пілігрымаў ды турыстаў.

**FORD.** Амэрыканская карпарацыя ўпершыню завалодала кантрольным пакетам акцыяў японскага аўтамабільнага канцэрну — "Форд" набыў 37% "Мазды". 11 красавіка, як толькі гэта стала вядома ў Токіё, па ўсёй краіне спыніліся біржавыя апэрацыі з каштоўнымі паперамі "Мазды".

Карпарацыя "Форд" праводзіць маштабную стратэгію пранікненьня ў нацыянальныя рынкі — ёй ужо належыць нямецкі "Опэль". "Форд" стварыў сваё лёбі нават у нярынкавай Беларусі, дзе будуе завод пад Менскам.

**КАТАСТРОФА.** Трагічна закончылася спроба сямігадовай амэрыканскай дзяўчынкі Джэсікі Дуброф стаць самым маладым пілётам, які пераляцеў тэрыторыю ЗША. Самалёт клясы "Сэсна" —такі самы, на якім калісьці Матыяс Руст прызямліўся ў раёне Краснай плошчы ў Маскве, пацярпеў аварыю. Загінулі сама Джэсіка, яе бацька і авіяінструктар, які мусіў страхаваць дзяўчынку ў выпадку экстрэмальнай сытуацыі. Прычыны катастрофы пакуль высьвятляюцца, але ўжо вядома, што палёту не спрыяла вельмі кепскае надвор'е з моцным ветрам і дажджом.

Варта згадаць, што ў свой час амэрыканскія выдаўцы "Кнігі рэкордаў Гінэса" выкрэсьлілі зь ліку рэкордаў палёты на самалётах, зробленыя малымі дзецьмі. Яны тлумачылі гэта небясьпекай, ў якую маглі б патрапіць тыя з-за свайго імкненьня пабіць рэкорд самага маладога пілёта.

Між іншым, расейская газэта "Комсомольская Правда" у сваім пятнічным нумары пасьпела падаць матэрыял пра пасьпяховае завяршэньне палёту, які насамрэч трагічна завяршыўся днём раней.

**ПАЖАР** у Дусэльдорфскім аэрапорце забраў жыцьці блізу 20 чалавек. Больш за сто чалавек пацярпелі таксама. Пажар распачаўся ў міжнароднай сэкцыі авіякампаніі "Люфтганза" ў кветкавай краме.

Мяркуецца, што прычынай сталіся зваркавая работы. Таксычны дым хутка разьнёсься па ўсім будынку аэравакзалу. Усе пасажыры былі эвакуяваныя, а палёты адмененыя.

**ЧАРНОБЫЛЬ.** У Вэне працавала міжнародная канфэрэнцыя "Дзесяць гадоў пасьля Чарнобылю". У ёй узялі ўдзел 700 дэлегатаў з розных краінаў сьвету. Моцная спрэчка ўсчалася на гэтай канфэрэнцыі паміж яе страшынём — міністрам навакольнага асяродзьдзя Ангелай Мэркэ і "зялёнымі". Яна сказала, што сёньня ёсьць неблагія шанцы для спыненьня дзейнасьці цяперашняй ЧАЭС да 2000 году, і прапанавала падтрымаць будаўніцтва новай АЭС чарнобыльскага тыпу, але з сучаснай і бясьпечнай заходняй тэхналёгіяй. Зялёныя, у сваю чаргу, прапанавалі тэрміновае закрыцьцё рэактару, бо яго нельга мадэрнізаваць, а колькасьць яговых ахвяраў з кожным днём расьце і налічвае тысячы чалавек. Чыноўнікі МАГАТЭ катэгарычна не згодныя зь "зялёнымі" і кажуць, што загінулі ня тысячы, а ўсяго 42 чалавекі: у першы год 28, а пасьля гэтага яшчэ 14.

**БАІ.** У Чачэніі працягваліся баі. Расейскія войскі перакрылі ўсе дарогі, што вядуць з гораў на раўнінную частку краіны. Са словаў міністра інфармацыі Чачэніі Маўладзі Удугава расейскія войскі працягвалі абстрэл некалькіх чачэнскіх сёлаў. Чачэнскія байцы, у сваю чаргу, у адным з раёнаў зайшлі расейскім войскам у тыл і пачалі зьнішчаць камунікацыі, тэхніку і асабовы склад. Карацей, як калісьці было ў Беларусі, — партызанка. Расейцы адказваюць на гэта прыблізна тым жа, як некалі ў Беларусі рабілі тыя, хто змагаўся з партызанамі ды іх памагатымі. Генэрал Шкірко заявіў, што будуць зьнішчаць апалчэнцаў, якія адмаўляюцца скласьці зброю. Паводле інфармацыі ІТАР-ТАСС колькасьць уцекачоў у горным Вядзенскім раёне дасягнула 20 тысячаў.

**НАВАДВОРСКАЯ.** Валерыі Навадворскай — лідарцы Дэмакратычнага Саюзу Расеі прад'яўлена абвінавачаньне паводле артыкулу 74 КК РФ (распальваньне міжнацыянальнай варожасьці). Пакуль што яе не арыштавалі, а ўзялі падпіску пра нявыезд з Масквы. Як піша "Комсомольская Правда", яна абвінавачваецца ў "наўмысных дзеяньнях, накіраваных на распальваньне нацыянальнай варожасьці, на прыніжэньне нацыянальнага гонару і годнасьці, прапаганду непаўнавартасьці грамадзянаў паводле нацыянальнай прыналежнасьці".

Так сувора да яе паставіліся не таму, што яна распавядала анэкдоты пра "чукчаў", "хахлоў", "чурбаноў" ды "жыдоў". Паводле заключэньня пракуратуры, яна "сыстэматычна выказвала меркаваньні і прапагандавала ідэі пра непаўнавартасьць расейскай нацыі ды еўныя прадстаўнікоў". Спадарыня Навадворская неяк заявіла ў газэце "Новый взгляд", што неад'емнай часткай расейскага характару зьяўляецца маніякальна-дэпрэсіўны псыхоз, што расейцаў "нельга з правамі пускаць у эўрапейскую цывілізацыю. Іх паклалі ля парашы і правільна зрабілі". А ў адным інтэрвію эстонскім карэспандэнтам яна заявіла, што расейцам уласьцівыя "лянота, беднасьць, бесхрыбетнасьць, рабства".

За свае радыкальныя погляды Навадворская ня раз перасьледвалася. Сама яна яшчэ ў 1988 г. сказала, што пабывала ў месцах зьняволеньня ажно 20 разоў!

**РЭФЭРЭНДУМ.** Падманваюць народ перад рэфэрэндумамі і ў Швэцыі. Днямі сталася вядома, што напярэдадні лістападаўскага 1994 г. рэфэрэндуму аб далучэньні Швэцыі да Эўрапейскага Зьвязу ад грамадзкасьці быў утоены даклад арганізацыі Генэральнага пагадненьня па тарыфах і гандлі.

У гэтым дакумэнце гаварылася, што сяброўства Швэцыі ў ЭЗ не прынясе краіне якіх-небудзь адчувальных эканамічных выгодаў, але, наадварот ускладніць яе дзеявыя зносіны зь дзяржавамі, што не ўваходзяць у Эўрапейскі Зьвяз. У дакладзе прадбачыўся рост цэнаў на імпартаваныя тавары. Відавочна, што такая інфармацыя магла адмоўна адбіцца на рашэньні швэдаў. Таму ўлады вырашылі тады засакрэціць дакумэнт. У выніку прыхільнікі далучэньня Швэцыі да ЭЗ атрымалі неабходныя ім 52,2% галасоў. Цяпер швэды зразумелі, чаму кошты прадуктаў ды іншых тавараў папаўзьлі ўгору. Ды позна.

**БАНДЭРОЛІ-БОМБЫ.** У ЗША агенты ФБР нарэшце схапілі так званага Унібомбэра — тэрарыста-адзіночку, які рассылаў поштаю бандэролі з бомбамі. Ім аказаўся 53-гадовы матэматык Тэд Кужынскі. За Унібомбэрам палявалі ўжо 18 гадоў.

Першы выбух ад яго бандэролі прагрымеў 26 траўня 1978 г. у адным з амэрыканскіх унівэрсытэтаў. Пасьля з рознай колькасьцю ахвяраў ягоныя "падарункі" выбухалі яшчэ ня раз. Сам Кужынскі тлумачыць свае дзеяньні ненавісьцю да згубнага для чалавецтва тэхнічнага прагрэсу. Нядаўна ён, пагражаючы чарговым выбухам, выклаў свае погляды на старонках буйной амэрыканскай газэты. "Маніфэст" сучаснага лудыта разьмясьціўся на чатырох газэтных палосах. Сам Унібомбэр жыў як пячорнік у хаціне, пабудаванай з ідэальнай арыентацыяй на восі поўнач-поўдзень, без электрычнасьці ды іншых выгодаў.

Тэда Кужынскага здаў уладам за мільён даляраў ягоны родны брат Дэвід з дабраслаўленьня іхняе маці. Як і заўсёды гэта адбываецца ў ЗША, партрэт Унібомбэра ўжо зьявіўся на тэнісках ды футболках, што прадаюцца па 20 даляраў за штуку.

**ІМЁНЫ.** Імя аднаго швэдзкага хлопчыка складаецца ажно з 43 знакаў. Дома яго завуць проста Альбін. Ягоныя бацькі, кіруючыся, як яны сьцьвярджалі, мастацкімі меркаваньнямі, прыдумалі яму імя, што складаецца з выпадковага набору 38 літараў, ды яшчэ дадалі пяць лічбаў у канцы.

Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, мясцовы суд адмовіўся прызнаць гэтую літарна-лічбавую камбінацыю за чалавечае імя,назваўшы яго бессэнсоўным. Мала таго, суд палічыў, што такое імя абражае годнасьць грамадзяніна Швэцыі, і аштрафаваў вынаходлівых бацькоў на 5000 тыс. кронаў. Тыя, у сваю чаргу, падалі ў апэляцыйны суд.

# Здарэньні

## СКРАДЗЕНА ЎСЁ, АКРАМЯ ПРЭЗЫДЭНТАЎ

У тым, што ў Менску вельмі шмат living рознага кшталту міліцыянтаў, мог пераканацца кожны, хто ўдзельнічаў у апошніх мітынгах. Зрэшты, нягледзячы на тое, што міліцыянтаў вельмі шмат, колькасьць крадзяжоў ды іншых злачынстваў не памяншаецца.

Вось і нядаўна, 8 красавіка, невядомыя злодзеі абрабавалі кватэру ўласнага карэспандэнта "Gazety Wyborczej" Цэзарыя Галіньскага. Увечары, а 8 гадзіне Цэзары пайшоў у рок-клюб "Адыс-Абэба" на канцэрт "Крамы", дзе й знаходзіўся да дванаццатай. За гэты час злодзеі звычайнай "фомкай" зламалі дзьверы ягонае кватэры, а потым вынесьлі з хаты ўсё, што ўяўляла нейкую каштоўнасьць: кампутар, тэлефон, відэамагнітафон, музычны цэнтар, тэлевізар. Цэзары вельмі зьдзівіўся, што акрамя гэтых безумоўна каштоўных рэчаў, скралі таксама некалькі пінжакоў і нават бавоўняных майкаў. Злодзеі вынесьлі й фанатэку Цэзарыя Галіньскага — аўдыякасэты ды кампакты. Нават мікракасэты для дыктафону — рэч чыста прафэсійную — гаспадару кватэры не пакінулі.

Пакінулі затое два партрэты прэзыдэнта, прыдбаныя Галіньскім у краме "Сьветач". На адным прэзыдэнт усьмешліва, на другім —сур'ёзны. У прыватнай размове Цэзары распавёў, што калі ён вярнуўся дахаты, дык убачыў разрабаваную кватэру і сярод кніг, шкарпэтак ды паперак, раскіданых на падлозе — два згаданыя партрэты. Як сумна зазначыў Галіньскі, скралі выключна матэрыяльныя каштоўнасьці, духоўныя — чамусьці, пакінулі. Затое зьнікла касэта з эксклюзыўным кліпам песьні "Новага неба" "Прэзыдэнт, ідзі дамоў!" Цікава, хто цяпер глядзіць гэты кліп?

*М.Агурок*

## НЕЎЗАБАВЕ

23 красавіка ў Альтэрнатыўным тэатры адбудзецца канцэрт гуртоў "НРМ" і "Уліс". Музыкі назвалі гэтую акцыю "Рок-альтэрнатыва ў "Альтэрнатыўным". Вячаслаў Корань зазначыў, што шоў будзе працягвацца каля трох гадзінаў, і гурты выканаюць шмат зусім новых, дагэтуль нікім нячутых песень. Гурт "НРМ" да ўсяго зьбіраецца паказаць народу рэмэйкі старых "мроеўскіх" песень у новым, "НРМаўскім", прачытаньні. Музыкі ўрачыста паабяцалі, што перад канцэртам і падчас яго будзе працаваць бар з шырокім выбарам напояў. Наведнікі мерапрыемства змогуць набыць касэты "НРМ" ды "Уліса".

*М.Агурок*

## МАСТАЦТВА Ў МАСЫ!

Вось ужо болей за месяц рок-гурт "Крама" дае сольныя канцэрты ў школах, вучэльнях ды іншых навучальных установах. Як сказаў дырэктар і тэкставік "Крамы" Зьміцер Лукашук, гэта выклікана цяжкім фінансавым становішчам "крамчукоў". Акрамя гэтага, частыя выступы ў школах спрыяюць росту папулярнасьці гурта. Гэтым самым заняліся б і іншыя беларускія гурты, але ня могуць сабе дазволіць з-за адсутнасьці апаратуры ды транспарту. "Крама" ж мае, хоць і ня лепшую, але апаратуру і мікрааўтобус. Такім чынам, цяпер менскія вучні замест штотыднёвых платных дыскатэкаў, якія ладзяцца ў школах, могуць патрэсьціся пад "крамаўскія" шлягеры.

*М.Агурок*

## ПРЭМ'ЕР-ЛАСУН

Выпадковы фатограф-аматар стаўся сьведкам таго, як прэм'ер-міністар Швэцыі Ёран Пэрсан патаемна еў цукеркі ў краме слодычаў.

Стакгольмская вечаровая газэта "Expressen" апублікавала ў панядзелак на першай старонцы фота прэм'ера, дзе ён засьпеты менавіта за гэтым заняткам. Пэрсан быў сфатаграфаваны выпадковым пешаходам, што, гуляючы суботнім днём у цэнтры Стакгольму, заўважыў прэм'ера краіны, які заходзіў у кандытарскую краму. Зацікаўлены пешаход вырашыў выпрабаваць свой новы фотаапарат.

У гэты час Пэрсан, хаваючыся за стэляжамі крамы, узяў з паліцы некалькі шакаладных ячэек зь лікворам і хуценька іх зьеў. Аднак тое, чаго ня бачыў уладальнік крамы, было добра відаць з вуліцы. Сьведка падзеі, напэўна, быў вельмі ўражаны паводзінамі прэм'ера, аднак не разгубіўся і зрабіў здымак, які і прадаў газэце. Пэрсан купіў у той краме шмат цукерак, але за патаемна зьедзенае не заплаціў.

Калі б уладальнік крамы своечасова заўважыў учынак прэм'ер-міністра, ён мог бы выклікаць паліцыю, і Пэрсану давялося б заплаціць 500 кронаў штрафу.

Газэта нагадвае чытачам, што вядомаму сваім надзвычайным апэтытам і празьмерную вагою Пэрсану ўжо колькі разоў здаралася паабедаць і пайсьці, не заплаціўшы. У адной з стакгольмскіх піцэрыяў, напрыклад, прэм'ер-міністру не хапіла 12 кронаў да поўнага рахунку. Розьніцыца канчаткова тады Пэрсану ўсё ж прыйшлося, аднак ён гэта зрабіў толькі пасьля шумных публікацыяў у прэсе. Здаецца, ласуну прыйдзецца даплаціць і на гэты раз.

*(пр)*

*Дубраўка Угрэсіч*

# Чыстае харвацкае паветра

Калі пачварную рэчаіснасьць вайны разглядаць як літаратурны твор, можна скласьці цэлы рэпэртуар апісальніцкае стратэгіі, слоўнік стылёвых прыёмаў, тропаў і фігураў. Прычым гэткі мэтад аналізу будзе такі ж праўдзівы (альбо непраўдзівы), як і любы іншы: палітычны, эканамічны, ваенна-стратэгічны ці псыхааналітычны. Бо ўрэшце ўсё пачалося са словаў і словамі скончыцца. Рэальны час "паміж" — тысячы забітых і параненых, перасяленцаў і выгнаньнікаў, зруйнаваныя дамы, вёскі і гарады — калісьці заменяць словы, а сёньняшняя трагедыя паўстане перад наступнымі пакаленьнямі ў разнастайных інтэрпрэтацыях — гістарычнай, паліталягічнай, вайскова-стратэгічнай, культуралягічнай, літататурнай...

Тады, калі грамадзяне Харватыі эўфарычна галасавалі на рэфэрэндуме за дзяржаўную незалежнасьць, у шапіках з сувэнірамі зьявіліся незвычайныя бляшанкі, падобныя на бляшанкі з-пад кока-колы. На іх быў намаляваны харвацкі герб і надпіс: "Чыстае харвацкае паветра". Гэты надпіс як найлепей спалучаўся з дэвізам папулярнай (на той час) тэлевізійнай рэклямы цукерак ад бранхіту "Лягчэй дыхаць". Такім чынам паўставаў выраз з новай сэмантыкай: "Чыстым харвацкім паветрам лягчэй дыхаць!".

Сёньня ўжо нельга знайсьці тых "палітычна-экалягічных" бляшанак, але ў продажы зьявіўся новы сувэнір: шакалядка ў выглядзе харвацкага пашпарту. Гандляры сувэнірамі пільна сочаць за разьвіцьцём палітычных падзеяў і ад "чыстага харвацкага паветра" (альбо абвяшчэньня незалежнасьці) перайшлі да "салодкага харвацкага пашпарту", што сымбалізуе сабою міжнароднае прызнаньне суверэннага гаспадарства.

А што сталася з чыстым паветрам? Просьценькая фраза, напісаная на пустой бляшанцы, ажыла, быццам дух, выпушчаны з бутэлькі, і пачала існаваць у рэальнасьці. Яна запанавала ў газэтах, на тэлевізіі, у палітыцы, у галовах людзей, увайшла ў штодзённыя размовы і штодзённае жыцьцё. Цяжка цяпер знайсьці артыкул у прэсе альбо тэлевізійную перадачу, дзе б не сустракалася слова "чысты", якое, ясная рэч, мае на ўвазе наяўнасьць свайго супрацьпастаўленьня — слова "брудны". Дзякуючы такой новаўсталяванай сыстэме каштоўнасьцяў, заснаванай на апазыцыі "чысты" — "брудны", жыцьцё раптам сталася вельмі простае.

Дух з бляшанкі ачышчае Харватыю ад зьнешніх ворагаў (а менавіта, ад сэрбаў, якія вядуць і якія даюць падставу для гэтай вайны).

## Бізантыйская кроў

Шматлікія прафэсійныя і добраахвотныя кантралёры, старанна спраўджаюць групы крыві харвацкіх грамадзянаў. Харвацкія грамадзяне самі панічна рыюцца ва ўласных ды чужых біяграфіях, адшукваючы там заганы. Адкрытае дэкляраваньне этнічнае прыналежнасьці сталася асноваю харвацкага бон тону, і таму заява аднаго з грамадзкіх дзеячоў ("Усім вядома, што ў маім радаводзе ўжо трыста гадоў не было бізантыйскае крыві"), якая дзесьці ў іншым месцы гучала б дзіўна, тут успрымаецца як мае быць. Такі новы стыль грамадзкага жыцьця запачаткавалі харвацкія палітыкі. Усё пачалося са словаў самога прэзыдэнта Харватыі, які заявіў, што ён шчасьлівы, бо ягоная жонка ані сэрбка, ані жыдоўка, а сапраўдная харватка. Зараз жа пасьля гэтага, беручы прыклад з прэзыдэнта, адзін з дэпутатаў парлямэнту сьцьвердзіў, што ён таксама шчасьлівы, бо мае жонку харватку, а не сэрбку, жыдоўку альбо, крый Божа, мурынку! Тое, што яшчэ два гады таму здавалася б кепскім жартам, ня вартым ужываньня, ці пералётным нацыяналістычным вірусам, сёньня ператварылася ў непісаны закон агульнапрынятага ладу жыцьця.

Бізантыйская кроў у новай сыстэме каштоўнасьцяў ("чыстае" — "бруднае") — гэта найбольш небясьпечная пляма. Бізантыйскі — гэта папросту іншае, больш вытанчанае азначэньне ўсяго сэрбскага, праваслаўнага, таго, што ў гэтай моўна-ідэалягічнай сыстэме азначае: хітры, брудны, фальшывы, а ўрэшце зусім адрозны ад нас.

Дух з бляшанкі — Містэр Чыстае Харвацкае Паветра — ачышчае харвацкую прастору ня толькі ад жывых, але і ад мёртвых ворагаў, пачынаючы з "сымбаляў улады антынароднага рэжыму", як вызначыў аўтар газэтнай публікацыі помнікі ахвярам фашызму, апраўдваючы іх зьнішчэньне.

Дух з бляшанкі паклікаў да жыцьця самазваных "ачышчальнікаў", "дынамітнікаў", якія ўзялі сабе за мэту ачысьціць з дапамогаю дынаміту харвацкія паселішчы ад дамоў, дзе жылі сэрбы, бо дамы гэтыя, на іх думку, ня вартыя таго, каб у іх жылі харваты.

У запале ачышчэньня ачышчальнікі карыстаюцца некалі бруднымі сродкамі. Напрыклад, абмазваюць дамы гноем. Такі арыгінальны мэтад ачышчэньня запачаткавалі жыхары адной з астраўных вёсак на Адрыятыцы. Там гэткім чынам быў ачышчаны дом непапулярнага экс-міністра былой Югаславіі, харвата. Мясцовая паліцыя ніякай ацэнкі гэткаму спосабу ачышчэньня не дала. Зрэшты, яна й сама ўжо цалкам прасякнутая духам новае гігіены.

***Харвацкія грамадзяне панічна корпаюцца ва ўласных ды чужых біяграфіях, адшукваючы заганы. Адкрытае дэкляраваньне этнічнае прыналежнасьці сталася асноваю бон тону. Усё пачалося са словаў самога прэзыдэнта, які заявіў, што ён шчасьлівы, бо ягоная жонка ані сэрбка, ані жыдоўка, а сапраўдная харватка.***

## Чыстыя харваты

Дух з бляшанкі закраўся таксама ва ўстановы, асабліва ў Міністэрства культуры, супрацоўнікі якога сталі найстараньнейшымі ачышчальнікамі. Яны ачысьцілі школьныя праграмы ад усяго "неўласьцівага", больш за тое, пані міністар культуры выдала інструкцыю, каб настаўнікамі харвацкае мовы былі "чыстыя харваты". Харвацкая грамадзкая думка моўчкі адрэагавала на міністэрскія ўказаньні. Аніводная ўстанова — нават унівэрсытэцкія факультэты харвацкае мовы й літаратуры — ня выказала пратэсту.



Містэр Чыстае Харвацкае Паветра закраўся таксама і ў бібліятэкі. Выконваючы няпэўныя рэкамэндацыі Міністэрства культуры, патрыятычныя бібліятэкары паціху адпраўляюць на склад кніжкі сэрбскіх пісьменьнікаў, ачышчаючы паліцы ад варожай кірыліцы, а таксама ад лацінскіх выданьняў, насычаных "югаслаўскім духам". На кніжках харвацкіх пісьменьнікаў зьявіўся прыгожа выкананы графічны арнамэнт, так званая харвацкая пляцёнка. Гэтая невялічкая адзнака ў будучыні будзе выразна адмяжоўваць харвацкіх пісьменьнікаў ад усіх нехарвацкіх, у тым ліку, напрыклад, ад Шэкспіра.

Містэр Чыстае Харвацкае Паветра зьмяніў старыя назовы вуліцаў, школаў, установаў, пляцаў. Гэты ініцыятыўны маленькі душок прасачыўся на прадпрыемствы, месцы працы і ўжо больш за два гады ачышчае прастору ад "неаднадумцаў".

## Харвацкія чарвякі

Апантанасьць чысьцінёю, якая ахапіла харвацкую прастору, ня грэбуе сваімі гратэскавымі формамі. Напрыклад, папулярная калісьці югаслаўская камэдыйная артыстка (якая выступала ў ролі простай, балбатлівай прыбіральніцы, а перадусім забаўляла як "прыбіральніца" падчас навагодніх урачыстасьцяў "дырэктара" Тыта) паведаміла ў нядаўнім інтэрвію, што хоча, каб пасьля сьмерці яе ахінулі харвацкім сьцягам ды пахавалі ў харвацкай зямлі. Бо толькі тады яна будзе пачувацца шчасьлівай, калі яе парэшткі будуць есьці — харвацкія чарвякі!

Словы "чыстае" і "паветра" ўвайшлі ў лексыкон найсьвяцейшых харвацкіх розумаў; калі ў адным з тэлевізійных выступаў вядомы харвацкі інтэлектуал пачуў недарэчнае пытаньне журналісткі: Якія жанчыны вам падабаюцца? — дык адказаў каротка і гэтаксама недарэчна: Чыстыя! Праз колькі месяцаў інтэлектуал будзе заклікаць тых чыстых жанчынаў, каб ахвяравалі жыцьцём сваіх сыноў у імя абароны свабоды, а яшчэ праз нейкі час пасьля гэтага ў прамове на пахаваньні палеглых жаўнераў скажа, што нам нельга нічым забрудзіць уласнае свабоды, бо і сьмерць нашая павінна быць чыстаю.

Харвацкія газэты перапоўненыя пагрозамі, і адна з найцікавейшых пагрозаў зноў жа зьвязаная з паветрам! "Калі ён і надалей мае намер дыхаць харвацкім паветрам, паводзячы сябе гэтак, як паводзіць сябе цяпер..." — пішуць звычайна разьятраныя журналісты. І пры гэтым маюць рацыю! Бо дыхаць харвацкім паветрам — адзінае, што застаецца грамадзяніну Харватыі. Бо на харвацкі хлеб яму хуткім часам ня хопіць грошай.

## Зласьлівы аповед пра некаторыя выключэньні

Мой артыкул — дарэчы, не надрукаваны ў айчынных газэтах — быў рэзка раскрытыкаваны ў харвацкіх сродках масавай інфармацыі. Нясьні тэкст стаўся калектыўнай уласнасьцю, а я, ягоная аўтарка, стала калектыўнай мішэняй журналістаў, калегаў-пісьменьнікаў, калегаў-выкладчыкаў, нядаўніх сяброў, знаёмых і незнаёмых людзей.

Мае экзэкутары абвінавачвалі мяне ў тым, што я скажаю факты, што зь некаторых (найчасьцей ужыванае слова!) выключэньняў зласьліва (другое найчасьцей ужыванае слова) выводжу агульнае правіла; што бачу Харватыю фашысцкай краінаю; што ані словам не ўспамінаю пра вайну, пра сэрбскую агрэсію і цяжкія страты харвацкага народу ў гэтай вайне; што пішу пра прастадушныя сувэніры, але нават не заікаюся пра сэрбскія "этнічныя чысткі". Адна з журналістак пачала свой артыкул з пытаньня, якой я нацыянальнасьці. Прэса наляпіла на мяне забаўныя палітычныя штампы: югонастальгістка, нацыянальны дальтонік, кабінэтная інтэрнацыяналістка; трохі пазьней — здрадніца Бацькаўшчыны, вядзьмарка; яшчэ пазьней — іншыя, больш страшныя і менш забаўныя. Ва ўсім гэтым скандале самае дзіўнае было тое, што абвінаваўчыя артыкулы стылістычна і тэматычна пераклікаліся з тымі творамі, якія я чытала, рыхтуючыся да іспыту па расейскай літаратуры (пэрыяд сталінізму!).

Я пагаджаюся са сваімі апантанымі экзэкутарамі, што мэтад зьбіраньня пэўных выпадкаў не дазваляе выявіць поўную карціну любое рэчаіснасьці, у тым ліку і харвацкай. Пагаджаюся таксама, што сэрбскія вайсковыя і калявайсковыя забойцы больш небясьпечныя і жорсткія "ачышчальнікі", пра што сьведчаць іхнія мэтады вядзеньня вайны ды статыстыка; магчыма, найперш трэба гаварыць пра іх. Аднак у Харватыі і так усе гавораць пра гэта: і журналісты, і літаратары, і палітыкі, і звычайныя грамадзяне.

Калектыўная згода на ролю ахвяры (нельга, аднак, аспрэчыць тое, што для гэтага існуюць паважныя падставы) зацямняе сьвядомасьць грамадзяніна Харватыі: на цяперашні момант ён увогуле не дапускае магчымасьці таго, што і сам трохі вінаваты.

## Як гуманіст і хрысьціянін

Нянавісьць да ўсіх сэрбаў (грамадзянаў Сэрбіі ды сэрбаў, грамадзянаў Харватыі) прымаецца ў Харватыі пад усеагульныя воплескі; нянавісьць "легалізаваная" ня толькі з дапамогаю сродкаў масавай інфармацыі, мясцовых уладаў, але таксама і з трыбуны такіх месцаў, як харвацкі парлямэнт, яна ўспрымаецца многімі, як зусім нармальная, сама сабою зразумелая эмацыйная рэакцыя. На адкрыцьці Заграбскіх міжнародных літаратурных чытаньняў старшыня Саюзу Харвацкіх Пісьменьнікаў (і былога Саюзу Пісьменьнікаў Харватыі!) сказаў: "Нам, як гуманістам і хрысьціянам, нельга ненавідзець ворагаў, але ад Бога дадзена нам права імі пагарджаць. І гэта будзе сутнасьць нашых адносінаў да сэрбскай дзяржавы і яе грамадзянаў на працягу некалькіх наступных пакаленьняў". Хто аспрэчыць тое, што Містэр Чыстае Харвацкае Паветра, малы душок зь бляшанкі, не кіруе прамоваю кіраўніка харвацкіх пісьменьнікаў, пісьменьніка, які "як гуманіст і хрысьціянін" абвяшчае пагарду да цэлага народу, пагарду, што "дадзеная ад Бога" і таму дапушчальная?

А яны, гэтыя выключэньні, памнажаюцца з кожным днём усё больш інтэнсіўна. Выключэньні ня ёсьць і ня могуць быць поўнай карцінаю харвацкай рэчаіснасьці. І мы маем тут справу — пагаджаюся з гэтым — з творчай фантазіяй непаслухмянага літаратара. Таму гэтаксама для ілюстрацыі прыводжу (сапраўды зласьліва!) словы лідара харвацкіх правых: "Мы прыйдзем да духоўнага адраджэньня, паміж іншага, тады, калі навучымся называць кожную рэч яе сапраўдным іменем. Мы доўга былі нявольнікамі ўласных памылак у справе адукацыі дзяцей, а ўрэшце ўсяго харвацкага народу. У працэсе духоўнага адраджэньня належыць змалку, а менавіта да таго, як дзіця спасьцігне таямніцы чытаньня і пісаньня, навучыць яго, хто зьяўляецца ягоным ворагам. А на нашай тэрыторыі ворагам зьяўляецца сэрб. Гэта ня значыць, што трэба разьвіваць у дзіцяці нянавісьць да такой ступені, каб яно пайшло назаўтра забіваць, але ад самага пачатку, гэтак жа, як пісаць, чытаць і прыстойна сябе павод-

*Адам Глёбус*

# Каталёнскі каляж



## Першае ўражаньне

У чужой краіне адразу заўважаеш, як шмат людзі гавораць. І хочацца зноў стаць мастаком, каб як мага менш адкрываць рот.

## Кроў

У жылах каталёнцаў замест крыві цячэ ўрачыстая жалоба. Нават на карнавалах іх улюбёны колер чорны.

## Крэсла

Калі амэрыканка сядае на каталёнскае крэсла, напалову яна застаецца ў паветры.

## Гадзіньнікі

У старога каталёнца, які піў піва й курыў цыгарэту ў маленечкім бары, на руцэ былі два гадзіньнікі. Спачатку падумалася: стары ведае пра хуткую сьмерць, таму праводзіць рэшткі жыцьця ў простых задавальненьнях. Алькаголь, тытунь і ўтульнасьць. А два гадзіньнікі яму спатрэбіліся, каб падмануць сьмерць: калі яна прыйдзе, — паказаць той гадзіньнік, які спазьняецца. Рамантычная мінорная здагадка. Толькі адзін гадзіньнік быў мужчынскі, а другі - жаночы, пэўна, ад жонкі-нябожчыцы.

## Твар

У вузенькай, як калідор у інтэрнаце, вулцы сутыкнуўся з жанчынаю. Будзённая сустрэча, такіх сто на дзень. Жанчына выгульвала чорнага чаў-чава. Давялося ўціскацца ў сьцяну і не з-за сіняга языка вялізнага сабакі, а з-за спалоху й гідкасьці... Жаночы твар быў суцэльна выштукаваны з рознакаляровых барадавак. Нават лупавастыя вочы вытыркаліся сьлізкімі барадаўкамі. І ў дадатак, рэдзенькія, як у віетнамскіх паэтаў, вусікі. Бы-р-р-р! Сальвадор-р-р Далі закахаўся б у гэткую суайчыньніцу зь першага погляду. Няма сумненьняў.

## Акуратнасьць

У Каталёніі ўсё акуратнае. І вуліцы, і пантофлі, і кветкі ў гаршчэчках. Паходзіш-паходзіш і паступова сам робісься больш ахайны, акуратны і крышачку драбнейшы. І хочацца пісаць невялікія, акуратныя творы, поўныя агню.

## Кавовы шумок

Майстэрства піць каву адразу не прыходзіць. Толькі здаецца што навучыцца кайфаваць ад кубачка чорнай кавы можна за адзін прысест. Я, напрыклад, гадоў пятнаццаць вучыўся зьбіраць лыжачкаю кавовы шумок. І цяпер зьбіраю яго дарэшты.

## Сьвята

Выпадкова трапіў на каталёнскае сьвята. Іграў на залацістых трубах духавы аркестар. Народ пабраўся за рукі і, парабіўшы колы, танчыў. Зь вялізных цэбраў разьлівалася чырвонае віно. На цэбрах былі надпісы "tareros". Хутчэй за ўсё, сьвяткавалі адкрыцьцё карыды. А можа й што іншае. На сьвяце я быў чужы, але ні на каліва не расстроіўся, бо цудоўна ўсьведамляў: і на беларускім народным (а тым болей дзяржаўным) сьвяце я ў сто разоў больш чужаніца, чым тут, пад Барсэлёнаю, у сьвяточным Січазе. Што зробіш, у мастакоў свае сьвяты. Мастак змушаны выконваць, зацьвярджаць, аздабляць і адзначаць уласныя сьвяточныя дні. Вось і менскі жывапісец Андрэй Радзівонаў падлічыў: калі Пікаса споўніцца 111 гадоў з дня нараджэньня, дык Хокусаю будзе 222. Прымітыўная гульня лічбаў, узятых на магілках. І разам з тым да пікасаўска-хокусаеўскага юбілею Радзівонаў напіша карціну "Сьляпыя", вольную імправізацыю паводле палатна Пітэра Брэйгеля мужыцкага. Сюжэт абраны не выпадкова, бо вельмі падобны твор ёсьць і ў найвялікшага мастака Японіі, Хацусіка Хокусая. Толькі японскія сьляпыя рухаюцца ня зьлева направа, а справа налева. Вось вам і сьвята, на якое Андрэй (мянушка Радзівон) запрасіў Хокусая, Брэйгеля, Пікаса і астатніх. Ні больш ні менш.

Жаданьне стварыць сваё, хай маленечкае, сьвята ніколі не пакідала і мяне. Відавочна, што гэта ні ў якім разе ня мой дзень нараджэньня. Новы год таксама ня зь лепшых варыянтаў, занадта шмат людзей весяляцца вакол сьсечаных ёлак. Вядома, пілаваньне дрэваў значна лепей за зьнішчэньне людзей дзеля нейкага там урачыстага застольля. Таму я адмаўляю ўсе магчымыя ахвярапрынашэньні дзеля сьвята. Варта пайсьці папярэдзе ўсведамленьня, выключна на пачуцьцёвым узроўні. Атрымалася Сьвята Сноў. Прысьніў добры сон — вось і Сьвята, ціхае, індывідуальнае. Толькі зусім ня лёгка прысьніць сьвятадайны сон.

## Расейскамоўныя

Ён і яна ідуць па пляжы ў Січазе. У яго на галаве накручана майка — султан. Яна, вульгарная, зь лілёвым засосам на кароткай шыі, тлумачыць: "Уяўляеш? Хлопчыкі прапаноўваюць сябе гэтак жа, як і дзяўчаты..." Ён хітае галавою, майка разгортваецца й падае на пясок.

## Magnifico

У кавярні Magnifico звычай зьбіраюцца геі. Вельмі прыстойная кавярня, вельмі заможная й дагледжаная публіка. Выдатныя афіцыянты, выхаленыя, дагледжаныя, у сьвежых кашулях. Бясконцыя нахілы, перапытваньні, удакладненьні замоваў. Ненавязьлівa, спакойна, утульна. Але ёсьць мухі. Напэўна, ад надушаных дарагой парфумаю геяў крышку патыхае гноем.

## Галубы

На барсэлёнскім бульвары Рамбла неверагодная колькасьць клетак з птушкамі. Шчабятаньне, шчоўканьне, пстрыканьне, лапатаньне. У самых разнастайных белых, жоўтых, залатых, круглых, квадратных, трохкутных клетках скачуць, сядзяць, дзяўбуць корм папугаі, шпакі, дзікія галубы, пеўнікі, кураняты. І толькі простыя, звычайныя, бела-шэрыя, бульварныя птушкі Пікаса, крылатыя душы Рамбла сядзяць не ў драцяных турмах. А мастаколяцца на іх. Як ім хочацца пабыць у залатых клетках?! Яны проста шчэмяцца туды, да начовачак з вадою, да бляшанак з крупамі, а наравістыя папугаі б'юць іх дзюбамі па галовах.

## Сьвечкі

У каталёнскіх касьцёлах памінальныя сьвечкі гараць у высокіх, круглых, гладкасьценных шклянках. Сьвечкі рознае даўжыні і рознага колеру, але аднолькавыя ў дыямэтры. Пастаўленыя на невысокія палічкі, яны складаюцца ў жывы вогненнавасковы вітраж, які зіхаціць, грае й зачароўвае.



## Цьвіль

У дварах гатычнага кварталу адзіная ўладарніца — цьвіль. Яе водар не зьнікае нават у самыя сьлякотныя й ветраныя дні. Бо ў барсэлёнскае цьвілі ёсьць самая адданая й безадмоўная сяброўка — бялізна, якую вывешваюць на гаўбцах. Яна размахвае лапатлівымі крыламі, сыпле дыямэнты кропель, і наталяе смагу сваёй зялёнавокай сяброўкі-цьвілі.

## Спалучаныя сасуды

Каталёнцы, як і большасьць паўднёвых эўрапейцаў, амаль не ўжываюць моцныя напоі. Яны п'юць віно. Увечары садзяцца за столікі невялічкіх рэстаранчыкаў і замаўляюць бутэлькі ружовага. Паціху, вельмі павольна, бутэлькі пусьцеюць, робяцца празрыстымі, а твары каталёнцаў, наадварот, ружавеюць і весялеюць.



## Настаўнікі і выдатніцы

Мужчыны-каталёнцы, як толькі пасівеюць, робяцца падобныя да настаўнікаў гімназіі. А вось паводзіны жанчынаў адпаведнага ўзросту зьдзіўляюць ня менш, бо яны набываюць падабенства з гімназісткамі-выдатніцамі, якія ў любое імгненьне гатовыя адказаць урок.

## Непатрэбная рэч

Ясным днём, седзячы ў барсэлёнскай кавярні й бачачы старога манаха з партфэлем і парасонам, ты выдатна зразумееш, што як толькі манах памрэ, самай непатрэбнай рэччу ў сьвеце стане дзіравы парасон, а вось партфэль і Біблія яшчэ прыдадуцца.

## Занятак

Адзіны занятак варты чалавека — сузіраньне за падзеньнем марской хвалі.

## Падарунак

Гуляючы па Січазе, я прыйшоў да могілак. З боку мора гэта — высокая доўгая сьцяна й больш нічога. І вось кавалак сьвежапафарба-

НАША НІВА 15 КРАСАВІКА 1996 №6(44)

*Міхаіл Гарбачоў:*

# “Шкада, што я не паслаў Ельцына ў Лацінскую Амэрыку зьбіраць лімоны”

**Што схіліла былога генэральнага сакратара ЦК праз пяць гадоў пасьля таго, як ён пазбавіўся ўлады, імкнуцца ў прэзыдэнты? Міхаіл Гарбачоў даў інтэрвію францускаму часопісу Paris Match.**



**— Тысячу разоў Вам задавалі гэтае пытаньне, але Вы ўхіляліся ад канкрэтных заяваў. Цяпер гэта рэч вырашаная: Вы вылучылі сваю кандыдатуру.**

— Ну так! (Сьмяецца). Я выстаўляю сваю кандыдатуру на прэзыдэнцкіх выбарах.

**— Вашы матывы?**

— У Расеі людзі незадаволеныя. Многія папракаюць тым, што я дазволіў Ельцыну прыйсьці да ўлады: “Дзе ж Вы былі тады? Чаму маўчалі? Вы заварылі гэтую справу, а цяпер адыйшлі ў цень! Чаму не адхілілі Ельцына?” Што адказаць? Я мог бы яго прызначыць паслом у Афрыку ці Лацінскую Амэрыку зьбіраць лімоны. Але я гэтага не зрабіў. Нават калі ў свой час я быў зацікаўлены пакончыць зь ім. У Ельцына царскія замашкі, ад ягонай палітыкі патыхае душком таталітарызму. Я ж прыхільнік дэмакратыі.

**— Ці Ваша сям'я падтрымвае Вас?**

— Гэта мая вялікая праблема. Цяпер на маім баку толькі мае ўнучкі, Ксенія і Анастасія. А Раіса Максімаўна і наша дачка Ірына супраць майго пляну. Але думаю, яны пагодзяцца. Мы ж адна сям'я, і яны пасьледуюць за мною, аднаго ня кінуць. Хоць мушу сказаць, што настрой дома ня надта вясёлы.

**— Вашыя ўнучкі былі сьведкамі змрочнага эпізоду ў жыцьці сям'і. Фарос, 91-ы год, пучысты. Хіба пасьля гэтага яны ня мусілі зьненавідзець палітыку?**

— Насьцю мы стараліся берагчы ад залішняй інфармацыі. Ёй было ўсяго чатыры гадкі, так што яна ня ведае пра тое, што здарылася ў Фаросе. А Ксенія захавала цяжкія ўспаміны. Яна і Раіса цяжка перажывалі.

**— Ходзяць чуткі, што здароўе ў Вашай жонкі кепскае. Ці згодныя Вы з тым, што падзеі 91-га году ў Фаросе фатальным чынам адбіліся на ёй?**

— Так, наступствы вельмі сур'ёзныя. На працягу паўтара гадоў яна была шпіталяваная. Сасуды ня вытрымалі напружаньня. Ціск пагоршыўся. Яна перажыла нэрвовы зрыў. Сёньня ёй нашмат лепей, але, відавочна, ранейшага здароўя ўжо не вярнуць.

**— Значыць, у яе ёсьць прычыны быць супраць Вашага рашэньня стаць прэзыдэнтам? Улічваючы сёньняшнія палітычныя норавы ў Расеі, Вас паспрабуюць прынізіць, навесьці паклёп. Вы ўжо трапілі пад падатковы кантроль і ў Вас адабралі службовую машыну.**

— Калі Раіса Максімаўна не падтрымвае мяне, то зусім не таму, што яна мой “ідэалягічны вораг”. Нам і цяпер помсьцяць. Напрыклад, калі я выяжджаю за мяжу, паслы атрымваюць загад не прымаць мяне. У паездках па Расеі тое самае: ніхто мяне не прымае, усе імкнуцца ачарніць. Толькі апошнім часам прэса Зюганава перастала выліваць на мяне тоны бруду. Аднак чым часьцей яны мяне цытуюць, тым вышэйшая мая папулярнасьць. Хоць ілюзіяў я не будую: у гэтай кампаніі бруду і шантажу зусім проста стаць ахвярай.

**— Калі Вы азіраецеся назад, у гісторыю, Вы ня думаеце, што памыляліся?**

— Я быў залішне ўпэўнены ў сабе. Дата падпісаньня саюзнай дамовы, праграма пераадоленьня крызысу і рэформы ўсярэдзіне партыі ўжо былі вызначаныя. З гэтага моманту толькі авантурысты маглі б перашкодзіць натуральнаму поступу наперад. Цяпер я ў думках часта кажу сабе, што ня трэба было тады езьдзіць у Фарос. Мая самаўпэўненасьць была ірацыянальная. Зрэшты, былі дапушчаныя і іншыя памылкі. Шмат памылак.

Сёньня, калі б я мог перапісаць гісторыю, то, магчыма, дзейнічаў бы з большай цьвёрдасьцю і ўладнасьцю, ня здраджваючы самому сабе.

**— Як кандыдат Вы павінны апублікаваць дэклярацыю аб Вашых даходах. Вашы супрацоўнікі сьцьвярджаюць, быццам Вы маеце дамы практычна ва ўсіх краінах сьвету.**

— На жаль. Крыніцы маіх даходаў усім добра вядомыя: аўтарскія правы, ганарары за канфэрэнцыі і пэнсія. А ў Маскве ў мяне ўсяго трохпакаёвая кватэра і дзяржаўнае лецішча. Не валодаю ані банкам, ані прадпрыемствамі. А яшчэ ўзначальваю фонд Гарбачова —свайго кшталту інтэлектуальны цэнтар.

**— Вы прэзыдэнт міжнароднага Зялёнага крыжа — экалягічнае арганізацыі. Вас сустракаюць на форумах тыбэцкіх манахаў або Шырлі Мак Лэйн. Ці рыхтуецеся Вы стаць адэптам Новае эры? Ці верыце Вы ў Бога?**

— Я ня ведаю, што такое Новая эра, затое цудоўна ведаю, што такое экалёгія і зьдзек з прыроды. Я атэіст. Мая маці часта паўтарала: “Я малюся за вас, бедныя вы мае атэісты”. І калі я быў на чале дзяржавы, то першае, што я зрабіў, — прыняў закон аб свабодзе веравызнаньня. І паверце, у тую эпоху гэта была задача ня з простых.

**— Якія, на Ваш погляд, галоўныя вартасьці і недахопы Міхаіла Гарбачова?**

— Ня мне адказваць на такое пытаньне.

**— А што думае пра гэта Раіса Максімаўна?**

— Напэўна, што я чалавек, усяго толькі чалавек. Але на мяне ўсё ж іншы раз можна разьлічваць. І мне вельмі пашанцавала ў жыцьці, што я яе сустрэў.

пытайцеся ў шапіках
“Белдруку”
і ў прыватных
распаўсюднікаў,
а яшчэ лепш – выпісвайце
НЕЗАЛЕЖНЫ ТЫДНЁВІК
НАША НІВА
наш індэкс 63125



Падпіска праз недзяржаўную сетку дастаўкі – тэлефон 29-22-10 (Цыбульскі Леанід).

## ФОТАЗАГАДКА



2

Вы мусіце назваць тое, што выяўлена на гэтым здымку. Той, хто слушна адкажа на пяць загадак запар і дашле свой адказ на адрас рэдакцыі, атрымае каштоўны прэзэнт. А той, хто адкажа першы, атрымае і самае каштоўнае, што ў нас ёсьць — “Нашу Ніву” на ўвесь год.
У наступным нумары — чарговая фотазагадка!

■ **МОВА**

## Ці калі-небудзь чалавецтва загаворыць на адной мове?



У Сьвятым пісьме сказана, што ўсе людзі сьпярша размаўлялі на адной мове. Сьцьверджаньне даволі сумнеўнае, як, зрэшты, і легенда пра тое, што Бог зьмяшаў мовы, калі людзі намерваліся ўзьвесьці Бабілёнскую вежу, каб дабрацца да яго нябёснага прыстанку.

Тым ня менш, хада падзеяў паказвае, што, магчыма, чалавецтва калісь будзе размаўляць на адной мове. За некалькі апошніх тысячагодзьдзяў колькасьць моваў на нашай плянэце значна зьменшылася. Такая самая тэндэнцыя захаваецца і ў XXI ст.

Прыкладна 10 тысяч гадоў таму, калі насельніцтва Зямлі складала каля мільёну, людзі размаўлялі на 10-15 тысячах моваў. Дагэтуль іх захавалася блізу 6-7 тысячаў. Але нават паводле самых аптымістычных прагнозаў лінгвістаў у наступным стагодзьдзі прынамсі тры чвэрці цяпер жывых моваў асуджаныя на зьнікненьне. А пэсымісты лічаць, што зьнікнуць да 90%. Такога меркаваньня трымаецца, напрыклад, бэрлінскі мовазнаўца Марцін Хаспэльмат.

Мовы зьнікаюць так імкліва, бо многімі зь іх карыстаюцца супольнасьці колькасьцю меншыя за 5 тысячаў чалавек. Гэткая небясьпека найбольш відавочная для моваў этнічных меншасьцяў Афрыкі, Азіі і Аўстраліі.

Для першабытнага грамадзтва было цалкам нармальна, калі невялікая група людзей размаўляла на сваёй мове. Гэта датычылася амаль усяго роду. І цяпер здараюцца сытуацыі, калі асобная вёска размаўляе на ўласным дыялекце. Аднак са зьменаю ўмоваў жыцьця і звычаяў радыкальна зьмяняецца і арэал распаўсюджаньня моваў. Іх зьнікненьне — зьява ня новая. Так, вымерлі старажытнаэгіпецкая, шумэрская, этруская. Новае — у хуткасьці й маштабах працэсу.

Павелічэньне мабільнасьці чалавечага грамадзтва, неабходнасьць адзінай, усім зразумелай мовы гандлёва-камэрцыйных сувязяў, палітычны і культурны ціск на нацыянальныя меншасьці, уплыў сродкаў масавай інфармацыі — усё гэта не спрыяе захаваньню моўнай разнастайнасьці.

Нэгатыўны ўплыў робіць таксама каляніялізм, генацыд. Калі 500 гадоў таму гішпанскія канкістадоры зьявіліся ў Амэрыцы, мясцовыя жыхары размаўлялі амаль што на 2200 мовах. Цяпер іх колькасьць зьменшылася да 600.

Аналягічнае становішча і ў Аўстраліі. Прыкладна з 200 моваў, якімі карыстаюцца на гэтым кантынэнце, 135 знаходзяцца на мяжы зьнікненьня. Прафэсар Міхаэль Краўс нядаўна падлічыў, што з шасьцісот моваў, уключаных у атляс сьвету, зьнікненьне не пагражае толькі тромстам.

*ДПА*

■ **МОДА**

## Містэрыя ў Дольным замку

***10 красавіка ў Дольным замку ў Вільні адбылося сьвята моды. На фэст зьехаліся мадэльеры з краінаў Заходняй Эўропы, Балтыі, Польшчы.***

Замак вялікіх князёў ужо колькі соцень гадоў ня бачыў падобнае ўрачыстасьці. Працэсія была апранутая ва ўборы часоў Сьцяпана Батуры і Боны Сфорцы. Пасьля выхаду князя й вітаньня гасьцей адбыўся баль... Адначасова ў будынку Арсэналу (Музэй дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва) адбывалася адкрыцьцё выставы аўтэнтычных старасьвецкіх убораў. А завяршылася ўсё канцэртам і велізарным фэервэркам.

Паказ калекцыяў стаў маніфэстацыяй новае балтыйскае моды. Пераважалі, асабліва ў літоўцаў, алюзіі на гістарызм і фальклёрнасьць, на “тутэйшасьць”, нават у выбары матэрыялу (пераважна мясцовае вытворчасьці). Французы ды італьянцы зь непрыхаванай цікавасьцю сачылі за кожным выхадам.

Дэманстрацыя мадэляў ад Вэрсачы, Армані, Лярана ды іншых слынных кутур'е засьведчыла намер эўрапейцаў ісьці да роўнага дыялёгу. Стомленасьць рэтраспэкцыямі ды неэўрапейскімі матывамі (да прыкладу , калекцыі Лярана 1992-1994), прымушае больш уважліва ўзірацца ў жывы традыцыяналізм суседзяў у Эўропе. Тымчасам літоўцы гатовыя прыняць на сябе мэсіянскую ролю большых эўрапейцаў за саміх эўрапейцаў.

Сёньняшняе сьвята моды — толькі рэпэтыцыя перад вялікім фэстам, што мае адбыцца ў Вільні праз месяц. Тады ўжо старая Вільня ўся стане вялікай сцэнаю для містэрыі.

*Сяргей Харэўскі*

